
Фёдар Нюнька ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

ЕЖЫ ГЕДРОЙЦ ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 31 (2620) Год LI | Беласток, 30 ліпеня 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Космас Рудні

Хто мог, прыехаў 22 ліпеня 2006 г. на адкрыццё і пасвячэнне помніка, пасобіў пры стварэнні кніжачкі-альбома пра Рудню. Гэта Віктар Бура (Рыбакі), Галіна Грыка (Беласток), Пятро Кузьміцкі (Беласток), Ян Анхім (Семенякоўшчына), Ніна Мядзведзь (Семенякоўшчына), Уладыслаў Крышэнь (Міхалова), Серафіна Казбярук (Бандары), Анатоль Бура (Нарва), Лявон Хлябіч (Нараўка), Ніна Вандалоўская (Беласток), Алена Ляўчук (Беласток), Мікола Казбярук (пасёлак Бандары), Міхась і Яўген Лаўрашукі (Беласток), Пятро Анхім (пас. Бандары), Юры Зюзя (Варшава), Ян Рыгаровіч (Беласток), Вольга Карчэўская (Беласток), Галіна Галёнка (Гайнаўка), Яўгенія Зянько (Беласток), Марыя Зянько (Беласток), Галіна Бура (Беласток), Зінаіда Пшыбыл (Беласток), Яўгіння Колтун (Гіжыцка), Вера Зарыч (Гіжыцка), Вольга Анцутка (пас. Бандары), Ніна Лукша (Беласток), Надзея Палецкая (Міхалова), Ганна Аляксееўна Лаўрашук (Міхалова), Ніна Матвяюк (Беласток), Пётр Бура (Гайнаўка), Зінаіда Шатыловіч (Беласток), Яўгенія Грыка (Беласток), Марыя Болтрык (Рыбакі), Яраслаў Стоцкі (Новая Лука), Анатоль Цімашук (Беласток), Раман Ляткоўскі (пас. Бандары), Мікола Хлябіч (Рыбакі), Ніна Лукша (солтыс Бандароў), Міхал Казбярук (Беласток), Валянціна Ласкевіч (Беласток), Ян Сычэўскі (Беласток), а. Славамір Тафілюк (прыход Юшкаў Груд), Аляксандр Кардаш (пас. Бандары).

Пры дарозе на Юшкаў Груд стаяў крыж, пры якім вёска Рудня развітвалася са сваімі адышоўшымі жыхарамі. Цяпер гэты крыж павернуты пярэднім бокам да шашы, а каля яго стаіць новы, які ўвекавечвае і тых, хто пакінуў Рудню, і яе самую — вёску, якой ужо няма. Засталася толькі назва на беразе месца, куды прыязджаюць людзі са свету, звабленыя чыстым паветрам, прыгожым прыпушчанскім краявідам і вадой у возеры, створаным чалавечай рукой — Семяноўскім вадасховішчы.

— Адзінай бачнай памяткай пра жыхароў затопленых вёсак з'яўляюцца прыдарожныя крыжы, — пісалі ў лісце войту Міхалоўскай гміны ініцыятары ўвекавечання Рудні — Віктар Бура, настаяцель Юшкаўскага прыхода а. протаіерэй Славамір Тафілюк, солтыс вёскі Бандары, Марыя Хлябіч і Лявон Хлябіч. Рашылі яны паставіць побач старэнькага, здавайны, крыжа новы крыж-помнік. Па праекце інжынера Лявона Хлябіча з Бандароў, „воднага" кіраўніка, які займаецца не толькі вадасховішчам, вярнуўшыся ў родную старонку.

Прыгадваюць яны гісторыю ў некалькі соцень гадоў вёскі Рудні, якая выдала шмат пакаленняў шанаваных, працавітых, набожных людзей. Рашэнне чыноўнікаў высокіх кабінетаў аб пабудове ў верхнім цячэнні Нарвы вадасховішча спрычынілася да таго, што страцілі зямлю і дамы людзі з пару соцень гаспадарак васьмі вёсак, з якіх пяць зніклі з картаў. Жыхары, у большасці праваслаўныя, не мелі мажлівасці выбару, вырваныя з радзімых гнёздаў. Шмат асабістых драм перажылі пераселеныя жыхары Рудні, Боўтрыкаў, Гарбароў, Буд, Лукі. Маральных страт не кампенсуюць ніякія матэрыяльныя сродкі.

— Не ўдасца вярнуць непаўторнага клімату былых прынарваўскіх вёсак, які так прыгожа ўвекавечыла ў сваіх кінакарцінах Тамара Саланевіч, выдатная дачка гэтай зямлі, — адзначаюць ініцыятары помніка-крыжа.

— Пры развітальным крыжы адбываліся найважнейшыя падзеі ў жыцці вёскі. Тут свяцілася пасха, маліліся за ўраджай, развітваліся з памерлымі. Уваходзячы ў вёску ці выходзячы з яе здымалі пры ім свае шапкі, кланяліся і жагналіся. Пры ім маліліся нашы людзі, калі адпраўляліся ў бежанства ў 1915 годзе. Маліліся і больш за паўстагоддзя пасля, калі зноў мусілі пакінуць свае хаціны і падацца ў новае бежанства. Праз момант іх каханую зямлю заліла вялікая вада. А людзі расцярушыліся па свеце.

Найбліжэй роднага гнязда апынулася Марыя Хлябіч. Яна сабрала ўсіх, хто мог прычыніцца да ўвекавечання памяці аб роднай вёсцы. Памаглі таксама ўправа Міхалоўскай гміны і Прадпрыемства гарадской гаспадаркі ў Міхалове. Лявон Хлябіч, аўтар праекта памятнай табліцы, тлумачыць сваю задуму:

— На табліцы — спачатку беларуская назва: „Вёска Рудня". Пасля тое ж па-польску. Тры даты — заснавання Рудні ў XVI стагоддзі, час, калі яна загінула — 1992 г., і цяперашні, 2006 год. Сем зорак, як сем нябесных сфер, Сонца і Месяц — як космас і вера самых першых жыхароў тутэйшай зямлі, якія гарманічна жылі ў прыродзе, і праваслаўны крыж. Унізе сімвалы руднянскай гісторыі — кола воднага млына, а пасля — вялікая сіняя вада, якая нахлынула і заліла ўсё, а на ёй плаваюць лодкі...

Міра ЛУКША

Самы сумны саміт ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Пра газ, Хамас і ні слова пра нас — так можна характарызаваць для беларусаў вынікі саміту краін Вялікай васьмёркі пад Пецярбургам. Наш „адвечны" спадзеў на дапамогу і вызваленне звонку, які перарос праз дзесяцігоддзі ў наіўную веру, стаў ужо неад'емнай часткай нацыянальнага менталітэту. Напярэдадні сустрэчы лідэраў васьмі краін, якая ўпершыню прайшла ў Расіі...

Каваль з Малочак ☞ 4

Уладзімір СІДАРУК

Будучы падросткам я стаў памагаць бацькам на гаспадарцы. Навучыўся я іграць на гармоніку і з аднавяскоўцам Мішкам Хмурам ды Лёнікам з суседніх Чахоў-Забалотных сарганізавалі вясковы аркестр. Мішка бубначом быў, а Лёнік іграў на скрыпцы. У шаснаццаць гадоў бацькі паслалі мяне ў Дубяжын, каб у Казіка Марціняка кавальскаму рамяству навучыцца. У каваля было трое дзетак, двух хлопцаў і дзяўчына. Я са старэйшым, Рыськам, сябраваў. Не адказваўся я таксама ад кампаніі з дубяжынскай моладдзю...

У Рагачах ☞ 5

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Побач адной з лясных дарожак з чыгуначнага прыпынку Баравікі ў бок Рагачоў стаіць мураваны крыж, пастаўлены ў 1970 годзе. Соснам вакол яго каля трыццаці гадоў. Значыць, крыж быў пастаўлены тады, калі яшчэ не было лесу, калі было поле, якое ў той час, мабыць, запускалася ў аблог, калі маладыя людзі масава сталі пакідаць вёску і палі трацілі сваю ранейшую прыцягальнасць.

Паэт Арлянскай зямлі ☞ 9

Віктар ШВЕД

Андрэй, нарадзіўся 31 сакавіка 1925 года і быў толькі на тыдзень малодшы за мяне. Пасля камасацыі вясковай зямлі ў 1935 годзе бацькі перасяліліся на свой хутар, што пад вёскай Тапчыкалы. Штодзённа са свайго хутара дванаццацігадовы хлопец хадзіў туды і назад 10 км у польскую сямігодку ў Орлі, так як я з маёй вёскі Мора. Быў ён адным з лепшых вучняў арлянскай школы. Вучыліся мы таксама разам і ў беларускай дзесяцігодцы ў Орлі, з якой увесну 1941 года былі накіраваны на Алімпіяду дзіцячай творчасці ў Бельск-Падляшскі: ...

У павуцінні чалавек як муха

Век XIX быў, здаецца, названы векам пары. Наступнае стагоддзе, XX, было абвешчана векам электрычнасці. А вось наша, XXI, — калі не памыляюся — мае быць векам інфармацыі. Інфармацыю заўзята апрацоўваюць перадавыя інстытуты ды найбольш мадэрныя прадпрыемствы. Сотні тысяч кандыдатаў і карыфеяў розных навук распрацоўваюць новыя тэорыі інфаабароту, іншыя займаюцца іх практычным прымяненнем, а ўсе яны на сваіх кангрэсах, сайтах ці семінарах абменьваюцца перадавым вопытам. Штораз больш тэрабайтаў у секунду кружыцца па сусветным павуцінні ў рознаэфірным асяроддзі. У любых абставінах карыстальнік новага мабільніка можа даведацца, колькі, напрыклад, сантыметраў мае Памэла Андэрсан у поясе, а колькі вышэй і ніжэй яго. Інфармацыйны воблік акружаючай нас прасторы становіцца больш насычаным, чым славутыя экватарыяльныя джунглі.

У сакавіку месяцы атрымаў я ад сямейнага лекара скіраванне да спецыяліста. Падаўся я адразу з тым скіраваннем у адну з беластоцкіх паліклінік, стаў у чаргу да рэгістры. Чарга была невялікая, але панюсям у акенцы было вельмі складана даведацца пра азы працы сваёй установы. Яны шмат варочалі папераў, кудысь тэлефанавалі, ганялі мышкі, барабанілі ў клавіятуру каб змагчы запісаць у чаргу аднаго пацыента. Дайшоў і я да акенца, падаў скіраванне.

— А вы ўжо лечыліся ў нас? — спытала мяне панюся.

— Так.

— А ў каторага лекара?

Я назваў прозвішча доктар Y. Панюся пагартала сшытак і сказала, што да яе можа мяне запісаць на снежаць. Значыць — за дзесяць месяцаў, амаль год цэлы. Я яўкнуў, што так доўга. Тады тая ж самая пані сказала мне пайсці да самой доктар Y — назвала мне нумар яе кабінета — і спытаць, ці не зможа яна прыняць мяне раней. Калі доктар Y згодзіцца, то і пані запіша мяне на ранейшы тэрмін.

Пайшоў я пад названы кабінет. Перад ім клубіўся натоўп народу. Калі я сказаў, што хачу толькі хуценька спытацца пра магчымы скарэйшы тэрмін, чакальнікі адказвалі, што і яны хочуць толькі спытацца; пра медыцынскія мэты чакання ніхто і не згадваў. Да таго ж усяго высветлілася, што пані доктар у кабінеце няма і ніхто не ведае калі будзе.

Не люблю таўчыся ў тлуме. Вярнуўся я ў рэгістрацыю і папрасіў „сваю" пазнюю каб вызначыла мне найранейшы тэрмін у любога лекара. Яна зашалясцела паперамі і назвала ліпень — на паўгода раней чым папярэднім разам. Я ад такой радаснай навіны адразу згадзіўся.

У назначаны дзень ліпеня падаўся я ў сваю паліклініку. Перад візітам у спецыяліста трэба прайсці адну праверачную працэдуру. Зайшоў я ў пакой, дзе тыя працэдуры праводзяцца. За адным сталом сядзела бяздзейна „мая" пані доктар Y. Працэдуру выканала працаўніца сярэдняга медыцынскага персаналу; пры нагодзе яна двойчы інфармавала мяне пра свае гадзіны прыёму і за кожным разам былі гэта іншыя гадзіны. Я хацеў забраць свой вынік, але жанчына, што выканала працэдуру, затрымала яго і сказала, што пані доктар неўзабаве там жа мяне прыме; трэба было крыху пачакаць. На калідоры пацікавіўся я гадзінамі прыёму; на дзвярах кабінета, у які я атрымаў быў скіраванне, вісела картачка, што пані доктар Y прымае ў іншым кабінеце, але не быў гэта пакой, у якім яна сядзела. Перад дзвярмі кабінета, якога адрас быў на картачцы, чакала некалькі чалавек; я не пацікавіўся, каго яны чакаюць, бо хваляваўся за свой прыём.

У той час пад кабінетам, у які былі мяне скіравалі з рэгістрацыі, стала збірацца чарга. І ніхто не ведаў, ці там нехта іх прыме. Бо дзверы ў той кабінет былі адкрыты, за шырмай гутарылі дзве асобы, пра якіх невядома было, ці гэта які лекар з пацыентам ці якая іншая пасядзелка. Ды і я разгубіўся, бо не ведаў, у які мне кабінет канчаткова падацца. На шчасце зараз паклікала мяне доктар Y. А калі я ад яе выйшаў, ужо пра суседнія абставіны не распытваў толькі хутчэй даў драла з тае ўстановы.

Калісь, калі я чытаў Яраслава Гашка, мяне вельмі здзіўляла, што ў 91-м кесарска-каралеўскім рэгіменце, які з Чэшскіх Будзеявіцаў адпраўляўся на фронт сусветнай вайны, адзін прафесар матэматыкі ніяк не мог падлічыць колькасці коней у вагоне: за кожным разам ён атрымліваў іншы лік. З таго часу мінула дзевяноста гадоў, за якія тэхніка імкліва рванулася наперад, а чалавек астаўся яшчэ больш адсталым.

Аляксандр Вярбіцкі

Самы сумны саміт

Пра газ, Хамас і ні слова пра нас — так можна характарызаваць для беларусаў вынікі саміту краін Вялікай васьмёркі пад Пецярбургам. Наш „адвечны" спадзеў на дапамогу і вызваленне звонку, які перарос праз дзесяцігоддзі ў наіўную веру, стаў ужо неад'емнай часткай нацыянальнага менталітэту. Напярэдадні сустрэчы лідэраў васьмі краін, якая ўпершыню прайшла ў Расіі, прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі склалі адмысловы зварот да кіраўнікоў краін васьмёркі. У заходнія амбасады перадаць яго ўдалося без праблем. А вось усе тэлефанаванні і прыходы да расійскага пасольства не далі нічога — сівых прафесараў і жывых класікаў літаратуры, якія складаюць гонар Беларусі, папросту „футболілі" і ўрэшце параілі даслаць зварот-заклік поштай. Выснова простая — з прадстаўнікамі дэмакратычнай, культурнай, апазіцыйнай эліты сённяшняя Расія размаўляць па-сяброўску не будзе ні пры якіх абставінах.

Не будзе яна падтрымліваць і тых палітыкаў, якія наўпрост заяўляюць, што пабудуюць з Расіяй лепшыя стасункі, чым цяперашні кіраўнік беларускай дзяржавы. Найяскравейшым прыкладам — суд над нядаўнім кандыдатам у прэзідэнты Аляксандрам Казуліным. Напэўна, экс-кандыдат, які лічыўся найбольш прарасійскім з апазіцыйнага кола, спадзяваўся на дапамогу Масквы. Але марна. Пяць з паловай гадоў турмы — такая цана ўдзелу ў выбарчай кампаніі. І справа Казуліна — цяпер толькі наша беларуская справа.

Няма чаго чакаць пагоды і з-за мора. Заходняму свету проста не да Беларусі, а калі наша чарга надыдзе, можа быць незваротна позна. У свеце вялікай геапалітыкі нашай краіне адведзена месца ў шостым-сёмым дзесятку. Да ўсяго магутныя краіны гістарычна звыклі змагацца з наступствамі праблемаў, а не з іх вытокамі і першаснымі прычынамі. Нават другая сусветная вайна не прынесла станоўчага навучання.

Саміт васьмёркі быў хіба найбольш фестывальным за ўсю гісторыю. На ім былі толькі дзве цікавыя рэчы для шырокага кола. Першая — гэта непрагназаваны залеў з градам страшнай моцы (нібы папярэджанне з неба ўсім зямным вяршыннікам лёсаў!). Другая — імправізаваны жарт Джорджа Буша, калі ён знянацку падскочыў ззаду да Ангелы Меркель і зрабіў ёй лёгкі масаж плячэй. Па-рознаму можна ацэньваць такія жарты і самога Буша, але гэты „палітычны каўбой" захоўвае рысы жывога чалавека. Цяжка ўявіць у падобнай фрывольнай ролі „жалезнага" Уладзіміра Пуціна, кожны рух і слова якога здаюцца прадуманымі загадзя ўсім упраўленнем Федэральнай службы бяспекі. Затое шыку і дзівосных страваў не забракла. Па ацэнках экспертаў, на сустрэчу лідэраў васьмі краін была выдаткавана рэкордная сума грошай. Што ж, у Расіі заўсёды любілі пампезнасць. Тым больш, што цяпер яе пусцілі за стол абраных. А Буш, якога бязлітасна крытыкавалі за прыезд і ўдзел, нават новы тэрмін прыдумаў — „дэмакратыя расійскага стылю".

Афіцыйна сустрэча праходзіла пад дэвізам „За энергетычную бяспеку", хаця ў павестцы было яшчэ колькі другасных праблемаў. А вось хто ад каго і калі мусіць бараніцца — гэта сапраўды пытанне. Той жа Расіі, здавалася, сам лёс наканаваў ствараць геапалітычную альтэрнатыву непрадказальнаму Усходу (адзін Кітай чаго варты!) і прадказальнаму Еўрасаюзу. Бяры і ўсталёўвай трывалыя партнёрскія стасункі з хрысціянскімі дзяржавамі — Украінай, Беларуссю, Грузіяй, іншымі суседзямі. Але ж не. Напярэдадні саміту праз расійскія масмедыі сталі паведамляць пра магчымыя правакацыі ў Паўднёвай Асеціі і Абхазіі нібыта з боку грузінскіх спецслужбаў. Расія даўно інспіруе там сепаратысцкія рухі, а зараз адчувальна запахла новай вайной. Прычым уражанне такое, што Расія хоча не столькі пачаць вайну (сумны досвед „міратворства" ў Ічкерыі міжволі мусіць стрымліваць), колькі палохаць іншых гэтай патэнцыйнай вайной (першым парадкам ЗША, у якіх там важныя стратэгічныя інтарэсы — прыкладам нафтавод Баку — Тбілісі — Джэйхан). Але вайна — гэта не покер і можна дагуляцца да сумных рэчаў.

Як бы там ні было, падобна, што Расія на даным этапе дамаглася свайго. Вайна, якую змушаны весці Ізраіль, адцягвае галоўную ўвагу ўплывовых краін ад працэсаў у самой Расіі і ад знешняй палітыкі Масквы. Тое, што апошняя не будзе нікога слухаць і не будзе зважаць на аніякія заклікі, пацвердзіў і той факт, што адразу пасля заканчэння саміту Крэмль правёў іншы — сабраў сваіх васалаў з СНД.

Уладзімір Хільмановіч

Вачыма еўрапейца

Як гэта сумясціць?

Заўсёды з цікаўнасцю чакаю і прыслухоўваюся заявам чарговых прэм'ер-міністраў і іх сеймавым экспазе. Так было і ў гэты раз, калі перад дэпутатамі аб сваіх будучых дзеяннях гаварыў прэм'ер Яраслаў Качынскі. Таксама і цяпер найбольш цікавілі мяне пытанні замежнай палітыкі, асабліва ўсходняй. У выступленні прэм'ера Качынскага канкрэтаў наконт гэтай палітыкі я пачуў няшмат. Старшыня Рады Міністраў гаварыў пад канец свайго экспазе, спасылаючыся на дзеянні Веймарскага і Вышаградскага трохкутнікаў і месца Польшчы ў Еўрасаюзе, наступнае:

— Мы хацелі б мець як найлепшыя стасункі з нашымі суседзямі на ўсходзе. Працягваем нашу падтрымку дэмакратычным рухам, але не хочам гэтай падтрымкі супрацьставіць імкненню да паправы адносін.

Падкрэсліў ён, што ў дачыненні да гэтых адносін — як гэта назваў — істэрыка вельмі перашкаджае:

— Тут мы, па-першае, мусім быць цярплівымі, па-другое —цярплівымі, і па-трэцяе — цярплівымі. Гэтыя працэсы для нашых усходніх суседзяў, а асабліва для нашага вялікага ўсходняга суседа, значыць, Расіі, будуць вельмі працяглымі.

І дадаў па-гістарыясофску:

— Проста, так складваецца гісторыя гэтай часткі Еўропы. Так складваецца гісторыя нашых адносін, адносін, у якіх шмат блага, але, што хачу адзначыць, шмат блізкага. Мы хацелі б, каб з часам тая блізкасць перамагла, а дрэннае было адкінута.

Далей ужо прэм'ер перайшоў да палітыкі ў дачыненні да Азіі, Лацінскай Амерыкі і Афрыкі. Наконт гэтага апошняга кантынента прагучалі, дарэчы, больш адназначныя дэкларацыі адкрытасці:

— Ёсць у гэтай частцы свету немалы рэзерв.

Я найбольш задумаўся над сцвярджэннем прэм'ера аб ахвоце да як найлепшых стасункаў з суседзямі на ўсходзе пры адначасовай падтрымцы дэмакратычных рухаў з аднаго і паправай адносін — як разумею — з афіцыйнымі ўладамі, з другога боку. Асабліва калі справа ў Беларусі — гэта прагучала прынамсі загадкава. Цяжка не згадзіцца з публіцыстам „Палітыкі" Яцкам Жакоўскім, які тую заяву пракаменціраваў такім чынам:

— Цяжка сумясціць падтрымку дэмакратычнай апазіцыі на Уходзе з паправай стасункаў з сённяшнімі правадырамі краін, якія з'яўляюцца нашымі ўсходнімі суседкамі. Вядома, што гэтыя кіраўнікі дзяржаў знаходзяцца часта ў вельмі прынцыповым канфлікце з дэмакратычнай апазіцыяй у сваіх краінах.

Не хапіла мне ў экспазе яснага акрэслення і адмежавання — хоць бы ў найбольш агульным сэнсе — палітыкі ў дачыненні да Расіі і Беларусі, а калі справа ў Беларусі — акрэслення, наколькі будзем салідарнымі з краінамі ЕС і ЗША ў націсках на знясенне, ці хоць бы абмежаванне, памкненняў таталітарна-дыктатарскага характару, а напэўна далёка недэмакратычных. Тым больш, што кранаюць яны немалой групы грамадзян Беларусі польскага паходжання.

Сабе на суцеху яшчэ раз прачытаў я экспазе папярэдняга прэм'ера Казімежа Марцінкевіча ў частцы датычнай усходняй палітыкі:

— Польшча моцна зацікаўлена стабілізацыяй за нашай усходняй мяжой. З уласнага досведу ведаем, што стабілізацыю гарантуюць перш за ўсё дэмакратыя і свабодны рынак. Таму таксама надалей будзем падтрымліваць нашых усходніх партнёраў і грамадствы ў справе рэформ, у пабудове структур дэмакратычнай дзяржавы і адкрытага грамадства.

Наконт гэтага (таксама наглядаючы пазнейшыя крокі Казімежа Марцінкевіча ў справе Беларусі) асабліва веру заявам Яраслава Качынскага, што дзеянні ягонага ўрада будуць працягам дзеянняў папярэдніка, толькі з бачным паскарэннем.

Мацей Халадоўскі

Свабода больш значыць як грошы

З Фёдарам НЮНЬКАМ — старшынёй Таварыства беларускай культуры ў Літве гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК.

— Якія справы зараз турбуюць беларусаў Вільні?

— У пачатку года ў нас адбылася справаздачна-выбарчая канферэнцыя, была абрана новая Рада таварыства. Пераважная большасць сяброў гэта людзі новыя. Рада, дарэчы, удалая, працавітая, салідная...

Якія ў нас справы? Мы працуем дзеля захавання беларускай спадчыны, якая была тут спрадвеку і сёетое ўдаецца нам зрабіць. Цяпер мы робім захады, каб устанавіць мемарыяльную табліцу Максіму Гарэцкаму, які жыў у Вільні з 1919 па 1924 год. Мы ганарымся, што такая таленавітая асоба беларускай літаратуры была звязана з Вільняй. Наша задача — аднавіць памяць аб ім.

— У час вандроўкі ў цэнтры Вільні мы сустрэлі літоўска-беларускую табліцу прысвечаную Францішку Скарыну. Там напісана, што Скарына — першадрукар Літвы. Якія асобы яшчэ ўвекавечыла Таварыства?

— Такіх мемарыяльных табліц у нас многа. Якія асобы мы ўвекавечылі? Гэта Кастусь Каліноўскі, гэта Янка Купала, гэта Рыгор Шырма, гэта Браніслаў Тарашкевіч, гэта Вацлаў Ластоўскі, гэта Пётр Сергіевіч, гэта ксёндз Адам Станкевіч...

— Стаяць вашы помнікі на могілках, згадаць хаця б намагільны помнік Францішку Аляхновічу на Росах?

— Мы паставілі пяць помнікаў відным дзеячам беларускай культуры, літаратуры, грамадскім дзеячам. Частка знаходзіцца на Еўфрасіннеўскіх могілках, іншыя стаяць на могілках Росы.

Апрача гэтага мы займаемся выдавецкай дзейнасцю, выпусцілі больш за дзесяць кніжак.

А зараз робім намаганні вакол арганізацыі Дзён нацыянальнай літоўска-беларускай культуры ў Вільні. Прыедуць суайчыннікі з Беларусі, з бізкага і далёкага замежжа. Нават абяцаліся прыехаць з Аўстраліі, чаго ніколі раней не было. Імпрэза адбудзецца 7-8 кастрычніка, і пакуль усё ідзе паспяхова.

— Вашы „Дні" адкрые сам прэзідэнт Літвы?

— Так, будзе прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус і таксама прэзідэнт Беларускай Народнай Рэспублікі на выгнанні Івонка Сурвіла. Апрача іх мы запрашаем шмат відных дзеячаў як з літоўскага, так і з беларускага боку. Лічу, што калі не будзе асаблівых перашкод, гэта будзе адно з нашых самых вялікіх дасягненняў. Ну, я б сказаў і такое — гэта будзе мой развітальны салют! Я ў Таварыстве ўжо 18 гадоў, пара даць дарогу маладым.

— А ёсць у вас бойкая моладзь, якая прадоўжыць справу?

— Ну, заўсёды маладыя павінны цягнуць, куды ім дзецца?

— Мы гаворым усё пра культуру, а якія палітычныя дзеянні праводзіць Таварыства?

— Няма нейкай мяжы паміж культурай і палітыкай. Нашы намаганні ідуць у падтрымку дэмакратыі ў Беларусі. Прымаем адтуль прадстаўнікоў, вядома, па меры магчымасцей. Словам, робім усё, каб яна — Беларусь — сапраўды стала незалежнай, свабоднай і дэмакратычнай краінай.



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Фёдар Нюнька: Скарачаецца лік беларусаў у Літве, таму што калі ў 1989 годзе было нас 63 тысячы, то потым, цераз гады было 55 тысяч, а паводле апошніх даных нас асталося ўжо пад 42 тысячы. Адкуль такая з'ява? Беларусы часткова з'ехалі за мяжу, часткова асіміляваліся. У самой Вільні было нас каля 30 тысяч, але свядомых беларусаў, на жаль, вельмі мала...

— Колькі беларусаў у Літве?

— На жаль, скарачаецца лік беларусаў у Літве, таму што калі ў 1989 годзе было нас 63 тысячы, то потым, цераз гады было 55 тысяч, а паводле апошніх даных нас асталося ўжо пад 42 тысячы. Адкуль такая з'ява? Беларусы часткова з'ехалі за мяжу, часткова асіміляваліся. У самой Вільні было нас каля 30 тысяч, але свядомых беларусаў, на жаль, вельмі мала.

— Ці віленская беларуская гімназія працуе ў карысць фармавання свядомасці?

— Я меў непасрэднае дачыненне да гэтага пытання і лічу, што без нашай дапамогі не было б гэтай школы. Сёння яна знаходзіцца пад кіраўніцтвам і ўплывам беларускай амбасады, значыць, існуючага рэжыму. Кантакты ў нас парваліся і мы іх не падтрымоўваем. Калі мы заснаўвалі гімназію, думалі пра яе як працяг той даваеннай беларускай гімназіі, якая была кузняй нацыянальна свядомай Беларусі. На жаль, сённяшняя сярэдняя школа гэта не той напрамак, пра які мы думалі, калі яе заснавалі.

— Знаходзімся ў абшырным памяшканні Таварыства, раскажыце пра вашу сядзібу?

— Ёсць у нас бібліятэчны пакойчык, дзе сядзіць наш бібліятэкар, ёсць пакой для пасяджэння Рады Таварыства, ёсць зала на 50 месцаў, тут звычайна праводзім нашы імпрэзы. Ну, і апрача гэтага, ёсць пакойчыкі, дзе можам прымаць гасцей з усімі выгадамі патрэбнымі для жытла. Чалавек, які застаецца ў нас, мае магчымасць памыцца, адпачыць, згатаваць на газе гарбату.

— Памяшканне вы атрымалі ад літоўскіх улад?

— Гэта наша ўласнасць, мы абмянялі гэтае памяшкане на тое, што мелі раней.

— Адкуль найбольш прыязджае да вас беларусаў?

— Бываюць з Гродна, бываюць з Мінска, бываюць беларусы з Польшчы, бываюць і з замежжа...

— Ці ў сувязі з апошнімі падзеямі ў Беларусі назіраецца новы працэс эміграцыі ў Літву?

— Не, не назіраецца. Ёсць іншае пытанне — у нас стаяла праблема з беспрацоўем. Калі мы ўступілі ў Еўрасаюз, пачалася масавая эканамічная эміграцыя, хоць, з'язджаюць у асноўным літоўцы. Таму на сённяшні дзень у нас няма беспрацоўя, толькі не хапае рабочых. У газетах поўна аб'яў, усюды патрэбны рабочыя людзі.

— Вы сказалі, што мерапрыемства ў кастрычніку будзе развітальным салютам. Якія дасягненні лічыце самымі важнымі на працягу Вашага 18-гадовага старшынства?

— Мне здаецца, што астанецца як памяць гэтыя 10 мемарыяльных табліцаў, на жаль, частка іх (яны былі зроблены з бронзы) былі скрадзены. Вось прапала табліца Пётру Сергіевічу, яна важыла пад 150 кілаграмаў чыстай бронзы. Яе немагчыма было зберагчы. Я сам кожны дзень ездзіў і глядзеў ці яна яшчэ стаіць! Вось адзін раз я заязджаю і гляджу — няма, пустое месца.

Іншыя дасягненні — напэўна наша памяшканне! Не скрываю, што гэта галоўным чынам мая заслуга, хоць гэта гучыць можа і не так сціпла. Гэта ўсё астаўляю тым беларусам, якія прыйдуць. Змаганне за сваё памяшканне — адвечная праблема беларусаў. Гляньце на даваенных беларусаў, хоць тады ў Вільні квітнеў беларускі рух, было шмат дэпутатаў польскага Сейма, працаваў музей, гімназія, дзейнічалі навуковыя таварыствы, працаваў касцёл, выходзіў дзесятак беларускіх газет і, аказваецца, ніхто не меў ні аднаго метра сваёй маёмасці. Таму, вось, нашыя сто квадратных метраў астануцца як мой падарак для будучых беларусаў. Я павінен сказаць, што гэта прэцэдэнт, ні адна нацыянальная арганізацыя ў Вільні не мае ўласнай маёмасці. Праўда, ёсць шмат польскіх арганізацый, але яны не маюць сваёй базы.

— Кажуць пра Вас, што на беларускую дзейнасць, патрапіце дастаць грошы „з-пад зямлі". Хто Вы па прафесіі?

— Я, інжынер. Нейкі час працаваў у лясной гаспадарцы, быў лесніком. Але паколькі я вырас і жыў у горадзе, я перакваліфікаваўся з лясного інжынера і стаў будаўнічым. Апошнія 25 гадоў працаваў я галоўным спецыялістам па каштарысных у праектных інстытутах. У мяне быў вялікі заробак, я атрымоўваў больш за тысячу рублёў. У той час праезд на тралейбусе каштаваў чатыры капейкі, *кілё* мяса — два рублі. Канешне, зараз мая пенсія далёка не такая, але я рады, што мы жывём у свабоднай краіне. У Літве сапраўдная свабода. Я ганаруся, што ўдзельнічаў у літоўскім адраджэнскім руху „Саюдзіс". І хоць зараз у нас ёсць эканамічныя складанасці, тым не менш, мы дасягнулі асноўнага — свабоды!

Так! Свабода, думаю, больш значыць як грошы.

Гутарыла Ганна Кандрацюк

Зачараваныя пушчай

10 ліпеня г.г. у Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна) закончыўся чарговы, пяты, пленэр, на які прыехалі сюды на два тыдні лепшыя жывапісцы з нашай краіны. Сёлета яны малявалі ваколіцы Баб'яй Гары, Косага Моста, дрыгву ў запаведніку Белавежскай пушчы, дзе — як сцвярджаюць мясцовыя жыхары — не ступала нага чалавека, а там, куды ён дабраўся, лясныя сховішчы ўражваюць сваім багаццем і разнастайнасцю.

Сёлета малявалі ў Нараўчанскай гміне, між іншым, Міхал Янчук, Ірэна Гарбец і Казімір Юргелянец з Беластока, Пётр Гаган і Віктар Кабац з Гайнаўкі ды Марэк Хомчык з Супраслі. Летні пленэр быў удалы. Жывапісцы намалявалі сама менш 2-3 карціны кожны. На наступны год запланавалі пленэр у Семяноўцы.

Плён сёлетняга пленэру — карціны маляваныя алейнымі фарбамі і акрылем ды пастэльныя малюнкі — можна будзе агледзець восенню: найперш у верасні і ў кастрычніку г.г. у Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы ды ў лістападзе ў новаадкрытай пастаяннай Галерэі імя Тамары Саланевіч у Нараўцы, у адрамантаваным драўляным прыгожым будынку з 1905 года.

Варта адзначыць, што на папярэдніх таксама летніх творчых сустрэчах артыстаў мастакоў у 2002-2005 гадах (іх было дагэтуль больш за сорак) найбольш цікавыя і прыгожыя закуткі ў даліне рэк Нарвы і Нараўкі ахвотна малявалі жывапісцы з Варшавы і Беластока. Іх захапілі тутэйшыя вёскі: Ляўкова, Масева, Нараўка і Скупава, поле, лугі, рака, узлескі ды захад сонца ў вясковай сцэнерыі.

(мох)

Адгалоска

У „Ніве" н-р 28 ад 9 ліпеня г.г. прачытаў я артыкул Уладзіміра Сідарука „У ЗУСе б'юць" і моцна над ім задумаўся. Калі б такое апублікавала „Ніва" ў 1970-х гадах, то працаўнікі ЗУСу мусілі б моцна тлумачыцца ў Ваяводскім камітэце ПАРП, Ваяводскай управе ды ў пракуратуры. На дадатак мусілі б, у вызначаны тэрмін, даць рэдакцыі адказ на крытычную публікацыю — такі тады быў абавязак кожнага прадпрыемства ці ўстановы. Цяпер установы ды прадпрыемствы забылі беларускую мову, працаўнікі не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць пабеларуску, хоць са сваімі бабулямі, дзядулямі ды бацькамі размаўляюць на роднай гаворцы.

Калі б такое было апісана ў семідзесятых гадах, то карэспандэнт атрымаў бы ўзнагароду, а некалькі асоб з ЗУСу паляцела б з пасадаў, патраціўшы свае мяккія крэслы. Цяпер у паліцыі ўсё вырашылі, спынілі следства, як я зразумеў, з-за малой шкоднасці Уладзіміра Герасімюка, што ён толькі панішчыў люстэрка вартасцю 500 зл. Але што Герасімюку пагоршала здароўе, лячыўся ў бальніцы і па сённяшні дзень дрэнна сябе адчувае — гэта ўжо следчага нічога не абходзіць.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Каваль з Малочак

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Мікалай Маркевіч у кузні

Пра мінулае вёскі Малочкі, што ў Боцькаўскай гміне, расказвае 72-гадовы Мікалай МАРКЕВІЧ, пенсіянер-чыгуначнік з Чаромхі-Станцыі.

У мінулым Малочкі налічвалі больш за сто гаспадарак. Земляробства было асноўнай крыніцай даходу сялян. Паколькі ў наваколлі пралягала шырокая прастора паш і сенажацей, вядучае месца ў гаспадарцы займала жывёлагадоўля. У майго бацькі было больш за дзесяць гектараў поля, пара коней, чатыры дойных кароў, некалькі штук маладняку ды свінак. Малочкаўскае поле знаходзілася ва ўрочышчах „Пэрша реза", „Друга реза", „Загородіска", „Глінка", „Старэ", „Хвоіна", а лес — на „Круглым" і „Хояніне". Сенажаці касілі ды жывёлу пасвілі на „Багне", „Осачыстым", „Загаті" і „Чэрэды". Найбольш пашыранымі прозвішчамі ў вёсцы былі Барташукі, Хількевічы, Філіманюкі, Гапанюкі і Руткоўскія. У сям'і ў нас было пецярых дзетак — тры дзяўчыны і двух хлопцаў. Самай старэйшай была Нінка. Пры немцах яе выдалі замуж у шаснаццацігадовым узросце, каб пазбегчы вывазкі на работы ў Нямеччыну.

Будучы падросткам я стаў памагаць бацькам на гаспадарцы. Навучыўся я іграць на гармоніку і з аднавяскоўцам Мішкам Хмурам ды Лёнікам з суседніх Чахоў-Забалотных сарганізавалі вясковы аркестр. Мішка бубначом быў, а Лёнік іграў на скрыпцы. У шаснаццаць гадоў бацькі паслалі мяне ў Дубяжын, каб у Казіка Марціняка кавальскаму рамяству навучыцца. У каваля было трое дзетак, двух хлопцаў і дзяўчына. Я са старэйшым, Рыськам, сябраваў. Не адказваўся я таксама ад кампаніі з дубяжынскай моладдзю. Паколькі я з сабою забраў гармонік, дык мясцовая кавалерка часта прасіла мяне іграць на забаве. Памятаю танцы на новазбудаваным мосце на рэчцы ў Падбеллі. Да раніцы тады гулялі. Паўтара года я вучыўся кавальскаму майстэрству.

Потым прызвалі мяне ў Службу Польшчы. Пачаткова працаваў я на пуцях у Загужу, пасля перавялі ў Баляславец у раён шахты медзі, дзе пачалася будова ліцейнага завода. У Загужу нам не плацілі, але ў Баляслаўцы частку грошай клалі на ашчадныя кніжкі. Памятаю, што вяртаючыся дамоў пасля шасцімесячнай службы за накопленыя грошы я купіў штруксавую куртку. У студзені 1955 года мяне прызвалі ў армію. Да прысягі прабываў я ў Грубяшове, затым перавялі ў Белую-Падляшскую ў будаўнічы батальён. Пасля абмундзіравання пераехалі мы ў Мінск-Мазавецкі. З нашага батальёна толькі адна наша рота была вылучана да загрузкі і разгрузкі будаўнічых матэрыялаў. У арміі служыў я толькі дзесяць з паловай месяца. У лістападзе 1955 года нашу часць дэмабілізавалі ў рамках скарачэння ўзбраенняў.

У пяцідзесятых гадах у Малочках арганізавалі калгас. Тры гады існавала калектыўная гаспадарка. У 1957 годзе Гамулка „разваліў" калгасы. У Малочках на ўспамін па камуне адно абора ды збожжавыя склады засталіся, з якіх пазней збудавалі святліцу. Пасля арміі вярнуўся я на бацькаву гаспадарку. Ажаніўся. Адкрыў кузню. Працы для каваля на вёсцы ў той час было многа, хоць адбаўляй. У шасцідзесятых гадах пайшла мода на вазы з гумавымі шынамі г.зв. „балянуўкі". Памятаю, што за адну зіму прыходзілася абкаваць дваццаць вазоў. Я купляў шыны ад чалавека з Войнаўкі, які прывозіў іх з Беластока і прадаваў на рынках. Паколькі наша сям'я пабольшала, а дзеці сталі падрастаць, дык прыйшла ў галаву думка перасяліцца ў горад, каб дзеткам стварыць лепшыя ўмовы для навукі. Разглядаўся я за кватэрай пачаткова ў Бельску, потым у Гайнаўцы. Не атрымалася. Сустрэў я аднойчы калегу з вёскі Чаромхі, Пятра Ляшчынскага, які раіў мне ўладкавацца на працу ў паравозным дэпо ў Чаромсе. Ідэя мне спадабалася. Засталася праблема жылля. З чарамшукамі я не мог дамовіцца наконт куплі дома. За драўляны дом ненайлепшай якасці прасілі 150 тыс. злотых. Праўда, падабалася мне забудова Зыгмунта Кастоўскага, але калі прыйшлося афармляць пісьмовую дамову куплі, дык гэты адмовіўся. Рашыў я затым купіць пляц і пачаць будову дома ўласнымі сіламі. Пляц купіў я за 34 тысячы ў Плахты і Апановіча. Дарагавата абышлася мне гэтая здзелка. Але і так нядрэнна ўсё скончылася. У ліпені пачаў я будаваць дом, а на зіму перайшлі мы жыць у сваю кватэру. У сакавіку 1969 года паступіў я на працу ў паравознае дэпо і працаваў там да жніўня 1991 года. Калі ўвялі закон аб ранейшых пенсіях, увольніўся я з работы і стаў пенсіянерам. Пасля перасялення з Малочак у Чаромху адкрыў я кузню на новай сядзібе, дзе па сённяшні дзень ёю карыстаюся. І тут для каваля знаходзіцца час ад часу праца. Аднак найбольш работы было ў 1975-1980 гадах, калі пайшла мода на жалезныя брамы. Кожная другая брама ў наваколлі Чаромхі гэта твор маіх рук.

— А што з сямейным жыццём? — пытаю.

— Жонка нядаўна памерла, — з сумам заяўляе калега. — Двое дзетак у свет падалося, а двое жыве ў Чаромсе. З нежанатым сынам старасці дажываю. Ад трох гадоў ён беспрацоўны. Цяжкавата часам прыходзіцца, але як-небудзь дажывем...

Варта тут прыкмеціць, што сын каваля Маркевіча, таксама Мікалай, па бацьку пайшоў. Майстраваць любіць. Яго хобі — ровары. Вось такім зараз (як на здымку) веласіпедам па Чаромсе ездзіць. Ды і ў Гайнаўку пад'ехаць на ім не праблема. У народзе кажуцць: „Які бацька, такі сын...". З Маркевічамі ў Чаромсе так справа маецца.

Уладзімір СІДАРУК

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Мікалай Маркевіч-малодшы са сваім роварам

У Рагачах

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Побач адной з лясных дарожак з чыгуначнага прыпынку Баравікі ў бок Рагачоў стаіць мураваны крыж, пастаўлены ў 1970 годзе. Соснам вакол яго каля трыццаці гадоў. Значыць, крыж быў пастаўлены тады, калі яшчэ не было лесу, калі было поле, якое ў той час, мабыць, запускалася ў аблог, калі маладыя людзі масава сталі пакідаць вёску і палі трацілі сваю ранейшую прыцягальнасць.

Сёлетняя зіма была халодная і доўгая, а лета не пашкадавала жары. Пад мастком на Нурчыку, праз які жвіроўка ад згаданага чыгуначнага прыпынку ўваходзіць у Рагачы, суха, хаця на берагах рачулкі захавалася яшчэ сакавітая зелень. Але далей тае зелені ўжо няма, усю траву выпаліла сонца.

Руху ў вёсцы амаль не заўважаецца, бо і людзі, як тая рыба глыбіні, шукаюць цяньку. Ды і тыя, якіх удаецца мне спаткаць, не надта ахвотныя да расказаў пра сваю вёску. Ці тут спрацавала стома ад спёкі, ці мо прынцып, што маўчанне золатам. Усё ж такі ўдаецца мне нешта пра Рагачы даведацца.

У першых днях чэрвеня вакол царкоўнага паркана стаялі рыштаванні для яго абтынкоўкі, бо агароджа рагачоўскага цвінтара была паднішчана часам і патрабавала аднаўлення. Рамонт меў закончыцца пад тамашняе прыхадское свята, якое выпадае ў дзень святога Антонія, 23 ліпеня. Паркан рамантавалі самі прыхаджане пад наглядам свайго старасты. У мінулым годзе была пабудавана новая галоўная цвінтарная брама.

Побач асфальтавай вуліцы, якая з'яўляецца адрэзкам шашы з Мілейчыч у Мядзвежыкі, насупраць царквы стаіць новая каплічка. Гэта „Водасвят", месца, дзе асвячаецца вада. Гэтая падзея адбываецца на Вадохрышча, Антонія і Прачыстую. Капліцу паставілі мо два гады таму за закалядаваныя тады грошы. Бо калі прадбачваецца нейкі выдатак, тады рагачоўскія харысты, што спяваюць на клірасе, падаюцца па сваім прыходзе з царкоўнай песняй і збіраюць ахвяраванні. Апошняе калядаванне было прысвечана куплі новага Евангелля.

Перад царквою, на разгалінаванні дарог у Мядзвежыкі і Мікулічы, пад дрэвамі, стаяць два крыжы — адзін мураваны, другі драўляны. Вось гэты апошні, драўляны, мае сваю адметную гісторыю. У палове трыццатых гадоў мінулага стагоддзя ў наваколлі Рагачоў на жывёлу ўпаў яшчур (pryszczyca). Тады людзі прынеслі іншае, неардынарнае, ахвяраванне. Мужчыны ноччу выконвалі драўляныя крыжы. А жанчыны ў той час у адных хатах пралі лён, па-суседску снавалі, яшчэ ў іншых хатах ткалі палатно — ручнікі для абвіўкі тых крыжоў. Не ўсю пражу ткалі, частку намотвалі ў клубкі; клубкоў было бадай чатыры кашы. І раніцай амаль усе прыхаджане з гэтымі крыжамі, ручнікамі і клубкамі пайшлі ў працэсію па палях і пашах. Ніткі з клубкоў зачаплялі за травы і кусцікі, крыжы ўкопвалі і абвязвалі ручнікамі. Адзін з тых крыжоў паставілі вось і перад царквой. І тая хвароба спынілася.

Грамадская актыўнасць жыхароў Рагачоў не спынілася і ў пазнейшы час. Грамадскім пачынам было пабудавана пажарнае дэпо, якое мела быць і вясковай святліцай. Ёсць там гараж для пажарнай машыны, у якім самаход „Жук" з помпай. Пажарнікаў цяпер у Рагачах нямнога, крыху за дзесяць малодшых мужчын. Але на першую патрэбу гэта дастаткова, бо пакуль хто звонку прыедзе на трывогу, то ўжо мясцовыя працягнуць шланг да рэчкі і загасяць агонь. Цяпер ужо і такая як сёлета засуха не з'яўляецца праблемай для пажарнікаў, бо ад двух гадоў у Рагачах працуе водаправод. Побач гаража ёсць зала, у якой калісь моладзь ладзіла забавы, а цяпер там спраўляюць памінкі. Адно з памяшканняў, што прылягала да згаданай залы, прадбачанае раней для буфета, войт некаму прадаў і той купец адкрыў у ім краму. Можа войт прадаў бы і больш, але пажарнікі не згадзіліся.

У Рагачах каля сарака хат, у якіх найчасцей жывуць адзінокія ўдовы, крыху ўдаўцоў, часам маці з сынам, а толькі ў дзвюх хатах большыя сем'і. У школу ў Мілейчычы гімбус забірае толькі чацвёра дзяцей з Рагачоў; у недалёкіх Мядзвежыках і зусім няма школьных дзетак. А калісь тут было поўна дзетвары. У палове трыццатых гадоў мінулага стагоддзя ім была пабудавана драўляная школа, якая занадта доўга не прастаяла, спарахнела. У 1968 годзе ў Рагачах быў здадзены ў карыстанне новы школьны будынак, мураваны. З-за дэмаграфічнага спаду школу ў Рагачах закрылі ў палове дзевяностых гадоў і той яшчэ не такі стары будынак астаўся самотны, нікому непатрэбны і паволі становіцца гістарычнай памяткай, руінай: трацiць шыбы ў вокнах, некаторыя канструкцыі рассыпаюцца ад сырасці, сам будынак штораз смялей атакуе і навакольная расліннасць.

Зямлю ў Рагачах абрабляе толькі некалькі гаспадароў. Толькі адзін трымае за дваццаць кароў, мае малочны бак, мае шмат сельскагаспадарчых машын; яшчэ на Галубоўшчыне адзін гаспадар мае ўмяшчальнік. У саміх Рагачах яшчэ толькі некалькі чалавек трымае па пяць-шэсць кароў, малако ад якіх здаюць у мясцовы пункт прыёму, адкуль забірае яго гайнаўская малачарня. Іншых вялікатаварных гададарак тут няма.

Згаданая крама ў будынку пажарнага дэпо — другарадная. Галоўная крама працуе амаль насупраць школьнага будынка. Калі добрае надвор'е, на лавачцы, што ззаду крамы, збіраецца мясцовы актыў, свайго роду некалькіасабовы арэапаг, які абмяркоўвае геапалітычныя і мясцовыя справы. А каму ўжо не пад сілу такая ўтомная праца, можа падацца ў Мілейчычы да лекара. А можна лекара паклікаць і з дамашнім візітам. І медсястра прыедзе ўкол зрабіць або вызначць узровень цукру ў крыві.

Дарога ў Мілейчычы добрая, асфальтавая. Два гады таму паклалі асфальт і на дарозе ў Мядзвежыкі. І добра гэта, толькі вось далей, ад Мядзвежык у Чаромху, дарога такая, што зубы можна згубіць. Але няма ахвотных брацца за прывядзенне яе да прыстойнасці, бо яна і з Мілейчыцкай, і з Чаромхаўскай гмін навонкі. Тое ж самае можна сказаць і пра Гайнаўскі ды Сямятыцкі паветы. Кажуць, што амаль цэлы бюджэт Мілейчыцкай гміны ўкладзены ў пабудову спартыўнай пляцоўкі для мілейчыцкай школы. А вось тая дарога ў Чаромху жыхарам Рагачоў патрэбная, бо па ёй лёгка было б даставацца і ў Бельск, і ў Гайнаўку. Ёсць яшчэ жвіроўка ў Дашы, але і яна слабаватая.

Гэтак пра дарогі мяркуюць самі жыхары Рагачоў; яны ім патрэбныя. Але ж калісь гэтаксама неабходнай была і школа, якая прывучыла мясцовых дзяцей да жыцця ў горадзе і яны пакінулі сваю вясковую школу непатрэбнай. Мо і вакол дарогі ў Чаромху вырасце такі лес, як і на чыгуначны прыпынак Баравікі, да якога грунтовая дарожка не перагружана рухам.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вакол закалоту

Маю ўвагу ў „Ніве" № 27 ад 2 ліпеня 2006 г. прыцягнуў артыкул „Закалот вакол кніжкі" і то не толькі таму, што быў ён надрукаваны на першай старонцы. Хвалюе мяне атмасфера, якая склалася вакол бібліятэкаркі Музея беларускай культуры ў Гайнаўцы Наталлі Герасімюк і яе праекта „Забытых таямніцаў чар", плёнам якога з'яўляецца нядаўна выдадзены аднайменны зборнік легендаў і аповесцей сабраных у наваколлі Белавежскай пушчы. Канфлікт паміж бібліятэкаркай і дырэктарам музея востра праявіўся ў час запланаванай на 21 чэрвеня прэзентацыі кніжкі, калі дырэктар імкнуўся не дапусціць да мерапрыемства і раздачы на ім кніжкі сярод удзельнікаў праекта.

І хаця прэзентацыя, у атмасферы скандалу, усё-такі адбылася, далей мяне хвалюе некалькі спраў. Напрыклад, за чые грошы выдадзена была кніжка „Забытых таямніцаў чар" і колькі на яе выданне прызначыў музей са сваіх сродкаў. Другая вельмі трывожная справа, гэта забарона бібліятэкарцы карыстацца музейнай апаратурай. Ці гэтая апаратура — уласнасць дырэктара? Мне здаецца, што музей і ягонае абсталяванне яшчэ не прыватызаваныя. Хочацца таксама запытаць саму Наталлю Герасімюк, як да яе ставяцца члены Прэзідыума Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры" у Гайнаўцы, якія займаюць высокія пасады ў горадзе. Баюся, што канфлікт у музеі можа адмоўна адбіцца на культурнай дзейнасці музея, паколькі ініцыятарам шматлікіх мерапрыемстваў з'яўляецца менавіта бібліятэкарка.

Віктар БУРА

Канікулы і... клопаты

Найгорш у канікулы на вёсцы старым людзям, асабліва тут, на Усходняй сцяне. У канікулы няма на чым даехаць да лекара ці дабрацца ў горад і вярнуцца дамоў. Так справа маецца з жыхарамі вёсак Бялкі, Агароднікі, Іванкі-Рагазы і Сакі ў Нарваўскай гміне, Гозьна ў Міхалоўскай ды Каўпакі ў Заблудаўскай гміне. На час канікулаў спынілі ім адзіны аўтобус, які з Нарвы ад'язджаў а гадзіне 6.40 раніцы ў Беласток, ды адмянілі аўтобус з Беластока ў Нарву а гадзіне 16.45. Гэтыя аўтобусы былі вельмі прыдатныя жыхарам згаданых вёсак. Хачу тут прыгадаць, што многа аўтобусаў з Беластока ў Гайнаўку праязджае прамой дарогай толькі праз вёску Анцуты (Нарваўскай гміны). Хапіла б толькі павярнуць па адным аўтобусе, зранку і ў пасляабедні час, а ўсе былі б вельмі задаволеныя. Людзі мелі б спалучэнне са светам і бесперашкодна дабіраліся б у горад.

Я звяртаюся з просьбай да Нарваўскага самаўрада, каб паразумеўся з войтам Міхалоўскай гміны і бурмістрам Заблудаўскай гміны і супольна пахадайнічалі ў дырэкцыі ПКС у Беластоку ці Бельску-Падляшскім або ў Маршалкоўскай управе ў Беластоку наконт лепшага курсіравання аўтобусаў на нашай тэрыторыі.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 34 -

Загаварылі ў доме пра іншапланецян. Усе — і мама, і тата, і бабуля, і Гражынка. Аказалася, кожны з іх мае нейкую ўяву пра „іншых". А ўсё з-за кругоў у збожжы, якія паявіліся і ў нашых баках, рэгулярна выціснутыя на ячменным полі. Мабыць, прыляцелі яны на нейкім касмічным караблі.

— Гэта зялёныя „чалавечкі", — заявіла бабуля. — Зусім да нас падобныя, адно зялёныя. З вузкімі вочкамі, на нагах і руках у іх перапонкі...

— А чаму — чалавечкі? — настабурчыў пёры Грак. — І чаму якраз зялёныя, а не чорныя? І тыя перапонкі!.. Ну, перапонкі... Хай будзе. У качак на нагах ёсць перапонкі.

— Я чытаў, што гэта могуць быць гады. Такія, як кракадзілы, скажам. У пачатку гісторыі нашай Зямлі паляцелі былі яны ў космас, а зараз вяртаюцца. Іхняя цывілізацыя намнога больш развітая ад нашай. Бачыце, як апанавалі яны палёты ў космас... А калі мы зможам адарвацца ад нашай Зямелькі?..

— Кракадзілы? — Грак ад абурэння цяжка засіпеў праз ноздры. — Толькі таму, што ў іх мозг большы за...

— Мабыць, гэта, усё ж, нейкія асобы жаночага полу, — у маме ў такіх момантах азываюцца феміністычныя ноткі. — Інтэлігентныя, цікавыя іншага свету...

— Нейкія зорныя кабеткі, якія выбраліся на іншую планету пабачыць тамашнюю моду! — тата заўжды ўяўляе, што кіруе светам усё ж мужчынскі пачатак. — Ды ж гэта, без сумнення, мазгавітыя асобені. Гэтак выціснуць кругі!

— Ну і што — кругі! — Грак стаў хадзіць па стале па крузе. — Ідзеш, ідзеш, адно звяртаць увагу трэба, каб ісці направа... Па спіралі...

Бац! — і грохнуўся Грак дзюбай аб стол — зусім закрунулася яму ў галаве.

— Га-га-га! — зарагатала мама. — Гэта пэўна нейкія падвыпіўшыя маладзёны, вяртаючыся з патанцоўкі ў святліцы, так выкачалі тыя кругі.

— Я сам увёў сябе ў хвалі альфа, паўтараючы гэты рух, — ачомаўся Грак. — Я таксама начытаўся пра тыя касмічныя ды іншыя нязведаныя справы. А тыя іншапланецяне дык проста — птушкі. Мы лятаем спрадвеку.

Міра ЛУКША

Я НАРАДЗІЎСЯ ТУТ (3)!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На пачатак: эсэмэска з ягуштоўскага летніка: — *Жыву 48 гадзін у суткі. Прыязджай да нас — сама пабачыш!*

Гэта вестка ад любай дачушкі, і яна падзейнічала як правакацыя. Па галаве сталі хадзіць усякія домыслы. Вядома, шмат чаго „добрага" можа начвэрыць кампанія, якой трынаццаць-шаснаццаць гадоў!

На месцы толькі пацвердзіліся яе словы — сапраўды летнікоўцы дыхалі поўняй шчасця — усе бадзёрыя, прыгожыя, расспяваныя і адначасова кемлівыя. Як паказалася, на эфект запрацавала займальная праграма і магія сяброўства.

— А зараз запрашаем на спевы і танцы, — апякункі Аліна Ваўранюк і Барбара Пякарская, пакуль усе завіруюць у скоках і адмысловых выкрутасах, запрэзентуюць сваё рукадзелле, раскажуць пра літаратурна-краязнаўча-гістарычныя дзеянні...

Сёння, пасля абеду, народныя спевы. У цэнтры мінчанкі Наталля і Алена. За адзін тыдзень дзяўчаты „адкрылі" ў гімназістаў голас. І зараз калі спяваюць *А я бачыў, бачыў — як ты волы гнала*, дрыжыць паветра. Галасы зліваюцца ў жывы, прыгожа ўфармаваны напеў. Словам — клас!

— У нас ніхто ўжо з маладых так добра не спявае, — хвалю майстрыхі, — вы проста іх зачаравалі!

— А ў вас усе таленавітыя — не астаюцца ў даўгу мінчанкі.

Яшчэ больш захопяць іх этнатанцы з элементамі лявоніхі і крыжачка.

— У першы дзень мы ўсе збіваліся з рытму, — прызнаецца другая апякунка Барбара Пякарская, — і колькі было смеху! Бо першая справа, каб перамагчы сябе. Сапраўды, ужо ў другі дзень многія пачалі танчыць. У трэці — амаль усе. Бо толькі дзве ліцэісткі — Еўка і Эмілля, не паддаліся шаленству.

— Бо тут — аматары танца згодныя аднадушна — найважнейшая адвага!

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Гутаркі пра асіміляцыю

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Летнік — „Я нарадзіўся тут” — творчы адпачынак для гімназістаў і ліцэістаў, праходзіў зноў у Ягуштове, з 10 па 16 ліпеня г.г. На ім пабывала 25 удзельнікаў з Беластока і Мінска.

— Што мы рабілі? — Аліна Ваўранюк, арганізатарка летніка, прэзентуе насценную газету з шаржамі літаратараў-„белавежцаў”. Выявы паэтаў — тут Надзея Артымовіч, тут Юры Плютовіч, тут Ян Чыквін, тут Зося Сачко, тут Юры Баена, — запоўненыя цытатамі з іх вершаў і біяграфій.

— А сёння мы пайшлі да людзей, — кажа Оля Максімюк, — і збіралі ўспаміны пра трагедыю вёсак Зані і Шпакі.

Пасля вячэры (якую рыхтуе сама моладзь) усе падрыхтавалі справаздачу. Гімназістка Оля напісала кранальнае апавяданне пра падзеі ў вёсцы Зані. Яе гераіня — дзяўчына ва ўзросце аўтаркі. Яна расказвае пра смерць сваёй маці і ўцёкі са спаленай вёскі (твор Олі будзе друкавацца ў „Ніве”). Аповед гімназісткі напамінаў жывую рэляцыю сведкі здарэння, невыпадкова ён узнік пад уплывам пачутых у Ягуштове ўспамінаў.

— Людзі былі пад уражаннем што пытаем іх пра такія справы, — кажа Оля, — яны адчувалі, што мы „свае людзі” і што захаваем іх успаміны ад забыцця.

Што такое здарылася ў Занях і Шпаках? — падумае наш чытач. У пачатку 1946 года банда „Бурага” расстраляла за 70 беларусаў — простых сялян, жанчын, дзяцей. Спаліла вёскі. Сем’і памардаваных паўвеку змагаліся каб даведацца праўды, і каб годна пахаваць сваіх родных.

Жудасныя падзеі аставілі задумацца над з’явай асіміляцыі.

ЗОРКА

Наш шырокі круг!

— Якая ідэя спалучае ўсе летнікі „Я нарадзіўся тут”? — мы спыталі ў арганізатаркі Аліны Ваўранюк, якая ўжо трэці год запар арганізуе творчыя адпачынкі для дзяцей і моладзі. Яны праходзілі ў Белавежы, Такарах, Сацах і ў Ягуштове.

— Нашы летнікі з’яўляюцца ў пэўным сэнсе працягам вашых „Сустрэч Зоркі”, — кажа настаўніца, — наколькі, „Сустрэчы” былі прысвечаны навуцы журналістыкі, нашы заняткі грунтуюцца на этнаграфіі і яны дапасаваныя да шырокага круга публікі.

На летнік у Ягуштове прыехалі ўсе ахвотныя навучэнцы беларускай мовы ў Беластоку. Разам, у малодшай і старэйшай групах, каля 50 асоб. На месцы іх чакалі заняткі па рукадзеллю, танцах і спеве, інтэлектуальныя задачы, а таксама веласіпедныя ды не толькі экскурсіі па наваколлі. Летнікоўцы маглі выказацца і жыццёвымі ўмеласцямі. Яны самі прыбіралі ў залах, рыхтавалі сняданак і вячэру.

— Якія тут атракцыёны? — нашы сябры найперш расказуць пра летніковыя „джакузі”. Пасля вялікага дажджу, які прышоў у сярэдзіне спякотных дзён, кампанія рванула пакупацца ў цёплых калюгах. Не менш радасці прынесла экскурсія па Бельшчыне, у гэты раз летнікоўцы наведалі Грыневічы, Кнаразы, Бельск-Падляшскі. У першай вёсцы пазнаёміліся з гісторыяй царазабойцы — Ігната Грынявіцкага.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Шмат часу было адведзена выцінанцы, з якой знаёміла Ніна Сакалова-Кубай. Тут таксама вучыліся ткацтва і вышыўкі. А Магда Карчэўская паспрабавала перанесці на паперу навакольныя колеры лета і малявала карціны. Летнік наведалі і нашы рукадзельніцы. Бабулі — Ніна Кучынская і Раіса Бурыла паказалі як на кручку вычараваць карункі! Усе дзеянні былі закрашаныя спевам і танцамі, якія вялі настаўніцы з мінскай студыі „Жыцень” — Наталля Жук і Алена Евемеляновіч.

Свае новыя ўмеласці нашы сябры паказалі бацькам, якія тлумна з’ехаліся на заканчэнне летніка.

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 31



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 27: Лес, жара, салома, рамонак, увага, Ас, кава, аўта, звер, агат, хмары. Лёс, рукавы, сава, самавар, логаў, жона, там, дама, нага, рака, ар, на, сваты.

Гедройц — Яновіч

„Каб пераканаць свет і саміх сябе, што належым Еўропе, мусім мець ясную ўсходнюю палітыку; мы павінны зразумець, што маем быць сувязным гэтых двух светаў, таму што наша пазіцыя на Захадзе будзе мерацца нашай роляй на Усходзе. [...] Галоўным пытаннем з'яўляецца праблема Беларусі. Мусім перш за ўсё паладзіць усе памылкі мінулага".

Так пісаў у тэксце падзякі ў 1998 г. Ежы Гедройц з нагоды прызнання яму дактарата *honoris causa* Універсітэта ў Беластоку. 27 ліпеня мінае 100 гадавіна ад дня нараджэння (прыйшоў на свет у беларускім Мінску) гэтага памерлага 14 верасня 2000 года князя-рэдактара парыжскай „Культуры", асеўшага пасля вайны ў французскім Мезон-Ляфіт і пад гэтай мясцовасцю пахаванага. Князю з Мезон-Ляфіт асабліва ляжалі на сэрцы справы суадносін Польшчы з яе суседкамі: Літвой, Расіяй, Беларуссю і Украінай. Аб справах беларускіх: „тутэйшых" і „тамашніх" карэспандаваў ён з пісьменнікам з Крынак Сакратам Яновічам. Рэдактар „Культуры" за яго намовай намерваўся папулярызаваць творчасць Васіля Быкава, хадайнічаць за прызнанне яму Нобелеўскай прэміі. У адным з лістоў Ежы Гедройц пісаў: „Ваша ідэя, вядома, знакамітая. Калі б удалося яе рэалізаваць, гэта — маеце рацыю — у сур'ёзны спосаб паўплывала б на сітуацыю Беларусі. Шанцы досыць малыя, ды ў кожным разе трэба спрабаваць". Цікавілі яго: біяграфія і пераклады, асабліва на рускую мову, і інфармацыі: якія ліберальныя расійскія колы падтрымлівалі Васіля Быкава. Сакрат Яновіч у лісце ў Мезон-Ляфіт данасіў: „Нобель для Быкава, пісьменніка сардэчна зненавіджанага мінскім рэжымам, стаў бы якімсьці землятрусам у тамашніх аблезлых пацукамі баках! Найгоршы дыктатар мусіць у найгоршым разе найменш што манерничаць, калі не памяняць тое ды сёе... Асабліва такі як Лукашэнка, які падабаецца Крамлю, ды адначасова зусім не ўяўляецца на такім Крамлі. Проста такі міжнародны фраер. Фацэт, якога можна выкарыстаць ды выкінуць. Каланіяльны туземны царок". Пішучы аб творчасці і сітуацыі Васіля Быкава, Сакрат Яновіч успамінае аб выданні ў Беларусі ягонай „Сцяны", кніжкі з такім самым загалоўкам, які носіць адзін з галоўных твораў кандыдата да Нобелеўскай прэміі: „Да сёння ў мяне непрыемнае пачуццё ад гэтай „тонкай афёры". „Сцяна" Яновіча мела паслабіць уздзейнічанне „Сьцяны" Быкава". У іншым з лістоў Сакрат Яновіч дзяліўся сваімі роздумамі: „Калі б здарыўся такі цуд, што Быкаў стаў бы лаўрэатам Нобелеўскай прэміі, была б гэта бомба для Беларусі! Вядома, у сферы свядомасці, ды стала б пачаткам працэсу яе адканалізоўвання. Паяўленне гонару ад уласнае краіны! Ад уласнае нацыі і яе мовы!" Ежы Гедройц не паспеў „заняцца" прамоцыяй да Нобелеўскай прэміі Васіля Быкава. Аднак беларускімі справамі цікавіўся амаль да канца. Яшчэ некалькі месяцаў да смерці цікавілі яго адказы з Крынак: „Як вы пракаменціруеце адмову Лявона Тарасэвіча прыняць узнагароду прэзідэнта Беластока?" Далей, спасылаючыся на выказванне тагачаснага консула Беларусі ў Беластоку: „Адна рэч, якая мяне задзівіла, гэта пазітыўныя адносіны да радыёстанцыі «Рацыя». Няшмат ведаю аб яе дзейнасці, але надалей у мяне вельмі адмоўныя да яе адносіны". Сакрат Яновіч спрабаваў тлумачыць: „Стасунак консула да „Рацыі", на мой погляд, падазроны. Гэта рух хутчэй накіраваны на мат: тая адкрытая сімпатыя да «Рацыі» можа знеахвоціць спонсараў... Аб сапраўдных намерах яго ведае ў нас кожнае дзіця". Высвятляючы рашэнне адмовы належна ацэненага ў свеце мастака з Валіл Лявона Тарасэвіча прыняць узнагароду Сакрат Яновіч пісаў у Мезон-Ляфіт: „Калі натрапіцца і мне нагода павесці сябе падобна як Лявон-Лёнік, несумненна, зраблю гэтак. Паколькі польска-беларускага паразумення на беластоцкім грунце няма ніякага, астаюцца нам толькі такія жэсты. Улады гатовы паліквідаваць беларускую меншасць, не столькі з-за застарэлай нянавісці да «кацапаў», што звычайна інструментальна: не могучы справіцца з гаспадарчымі праблемамі, асабліва ў перамаганні нэндзы мястэчак і вёскі, пагульваюць электаральна на антырускім комплексе грамадскасці палякаў". І ўспомніў тады аб сваёй ацэнцы сітуацыі ў шырэйшым кантэксце: „У польска-беларускіх стасунках можна гаварыць не столькі аб нейкім супакаенні, а хутчэй аб адмаўленні сур'ёзнага трактавання Лукашэнкі, што цяжка палічыць палітычна разважным. Ды вынікае гэта ўвогуле з-за недахопу канцэпцыі ўсходняй палітыкі, якую стасуецца часова, без дальнабачных планаў. Свет не канчаецца — як здаецца варшаўцы — на Бугу, адно трэба зважаць, каб нейкі варвар не пачаў майстраваць нам каля дупы... Непатрэбна акцэнтуецца неабходнасць не дражніць Лукашэнку, які ўмее ж крыўдануць беларускіх палякаў у сябе, якіх робіць такім чынам заложнікамі міждзяржаўнай палітыкі [...]. На такім апякунстве ніколі і ніякая нацыянальная меншасць не выйшла добра, калі сама не згаварылася з урадам краіны пражывання. Гульня інтарэсаў, вось, заўжды брутальная і як найдалейшая ад якога-небудзь дабрачынства".

Сакрат Яновіч

Ежы Гедройц

27 ліпеня мінае 100 гадавіна ад дня нараджэння (прыйшоў на свет у беларускім Мінску) гэтага памерлага 14 верасня 2000 года князя-рэдактара парыжскай „Культуры", асеўшага пасля вайны ў французскім Мезон-Ляфіт і пад гэтай мясцовасцю пахаванага.

Ежы Гейдройц яшчэ ў 1998 г. выдаў беларускі нумар парыжскай „Культуры". Сакрат Яновіч пасля ў адным з тэкстаў успамінаў: „«Культура» Ежы Гедройца наймацней захапіла мяне належнай ацэнкай беларускай праблематыкі, да якой у свой час ставіліся дэманстратыўна зняважліва. Калі прызнаюся час ад часу, што працэс выспельвання маёй беларускай нацыянальнай свядомасці ў значнай ступені заўдзячваю палякам, то заўжды маю на думцы кола чытачоў парыжскай „Культуры", якое моцна выявілася перада мною ледзь пры схіле ПНРу".

Ежы Гедройц быў — як яго назвалі — сумленнем народа. Сейм РП папярэдняга склікання абвясціў 2006 год Годам Ежы Гедройца. Таксама ў Беларусі ў сотую гадавіну ад нараджэння рэдактара парыжскай „Культуры" памятаюць аб ім. А ў Беластоку? Як інфармуе апошні нумар „Часопіса", з якім звязаны Сакрат Яновіч і якога публікацыі выклікалі зацікаўленне Ежы Гедройца, дзве выставы, прысвечаныя яму („Ежы Гейдройц і дупло «Культуры»" ды „Ежы Гедройц і Загубленыя рамантыкі") аб'язджаюць больш за сорак гарадоў Польшчы. На шляху няма прыпынку ў Беластоку.

Раіна Стэфанчук

Без сумнення — канец

Прыгавор беластоцкага Раённага суда ў г.зв. справе „Нівы" не будзе абскаржаны Пракуратурай Беласток-Поўдзень. Так вырашыла ў апошнія дні яе кіраўніцтва, якое паўтара года таму накіравала акт абвінавачання.

— Пасля аналізу абгрунтавання прыгавору і акту абвінавачання кіраўніцтва пракуратуры пагадзілася з аргументамі суда. Мы прынялі, што і так як суд можна ацэньваць гэту справу, — сказала „Ніве" намесніца пракурора Пракуратуры Беласток-Поўдзень Анна Гедрыс.

Прыгадаем. На лаве абвінавачаных селі адзінаццаць членаў Праграмнай рады нашага тыднёвіка. Галоўныя абвінавачаныя: тагачасны яе шэф Яўген Мірановіч і глаўбух Марыя Паўлючук. У пракуратуру, а пасля ў суд, заява аб пакаранні трапіла пасля кантролю Найвышэйшай кантрольнай палаты, якая сцвердзіла, што ў 2001 г. — да канца сакавіка 2003 г. дайшло да шэрагу фінансава-рахункаводчых няправільнасцей ды несумленных разлікаў датацыі і ўпісвання неадпаведных інфармацый пры хадайнічанні за іх. На думку пракуратуры, неналежныя датацыі сягнулі сумы больш за 99 тысяч злотых. Пракуратура хацела пакараць Яўгена Мірановіча васьмю месяцамі турмы з умоўным пакараннем на тры гады з і 3 тыс. зл., а галоўную бухгалтарку годам турмы з умоўным пакараннем на тры гады і 3 тыс. злотых. Наконт апошніх абвінавачаных Пракуратура Беласток-Поўдзень прапанавала ім спыненне справы з умоўным пакараннем на год і па 500 злотых. Дзевятка абвінавачаных адмовілася ад спынення і рашыла сваю справу вынесці на разгляд суда.

Суддзя Кшыштаф Казлоўскі абвінавачаных апраўдаў, а ў выпадку некаторых абвінавачанняў у адрас Яўгена Мірановіча і ўсіх у адрас Марыі Паўлючук спыніў. Суддзя ў той час так гэта абгрунтоўваў:

— У абгрунтаванні акту абвінавачання дарам шукаць адказу на пытанне, на якой падставе пракурор палічыў, што абвінавачаным можна прыпісаць наўмысную віну.

Паказаў:

— Абвінавачаныя не мелі ніякай рацыянальнай прычыны, каб падаваць у рахункаводчых кнігах і фінансавых справаздачах несумленныя даныя.

І далей:

— Іх дзеянняў нельга трактаваць у катэгорыі злачынстваў.

Каб урэшце заявіць:

— Відавочна, па-за пракурорам і, можа, асобамі непрыхільнымі абвінавачаным, ніхто не быў зацікаўлены пакараннем Яўгена Мірановіча і Марыі Паўлючук.

Цяпер, пасля канчатковага рашэння пракуратуры, цяжка не пагадзіцца з думкамі назіральнікаў, выказанымі пасля судовага прыгавору, што „гэты працэс быў непатрэбны".

Абаронцы таксама не будуць адклікацца ад прыгавору. Стане ён правамоцным з канцом ліпеня.

Р. С.

Паэт Арлянскай зямлі

Маці Андрэя Грайко, Матрона, была роднай сястрой майго бацькі Мікіты. Пасля заканчэння I сусветнай вайны выйшла яна замуж за Івана Грайко, жыхара вёскі Пашкоўшчына, што ў Арлянскай гміне.

Іх сын, Андрэй, нарадзіўся 31 сакавіка 1925 года і быў толькі на тыдзень малодшы за мяне. Пасля камасацыі вясковай зямлі ў 1935 годзе бацькі перасяліліся на свой хутар, што пад вёскай Тапчыкалы. Штодзённа са свайго хутара дванаццацігадовы хлопец хадзіў туды і назад 10 км у польскую сямігодку ў Орлі, так як я з маёй вёскі Мора. Быў ён адным з лепшых вучняў арлянскай школы. Вучыліся мы таксама разам і ў беларускай дзесяцігодцы ў Орлі, з якой увесну 1941 года былі накіраваны на Алімпіяду дзіцячай творчасці ў Бельск-Падляшскі: я — са сваімі вершамі, а ён — як дасканалы дэкламатар. Пад савецкай уладай Андрэевы бацькі паслалі старэйшага сына, Сцяпана, на чыгуначныя курсы, пасля заканчэння якіх працаваў ён дзяжурным руху цягнікоў на станцыі Рыгораўцы аж да выхаду на пенсію. Сына Андрэя, на жаль, бацькі пакінулі на гаспадарцы. Патрэбная яму была, аднак, далейшая адукацыя для ўласцівага развіцця паэтычнага таленту. Што праўда, у вольныя хвіліны ад працы на гаспадарцы пачаў ён пісаць вершы на беларускай і польскай мовах, якія карысталіся вялікай папулярнасцю не толькі сярод мясцовага насельніцтва.

Paszkowszczyzna, data
Komitet Centralny
Polskiej Zjednoczonej
Partii Robotniczej
Dobrze ludziom się powodzi teraz na tym świecie,
Gdzie nie zajdziesz — wszędzie światło,
Mnie jakby coś gniecie.
Dawno planowali, zrobić obiecali,
Ale jakby kto przeklinał żeb nie doczekali.

I pół litra bym postawił, szczerze bym ugościł,
Kiełbasy palcem upychanej zakąsić bym prosił.
Gdyby wiedzieć gdzie i komu, to prezencik damy,
Bo my światło elektryczne to bardzo pragniemy.
I cielaka czy też byczka, co to roczek mija,
My jesteśmy tego zdania, żeby za to sprzyjać.

O, Komitet Centralny, a może Edward Gierek,
Wszystko wyrównamy, toż nie za cukierek.
Zróbcie nam to światło, wszystko wyrównamy,
Bo jest nas we trzech gospodarzy, wszyscy my żądamy!

Пісьмо-верш адпраўлены ў ЦК ПАРП у справе электрыфікацыі трох пашкоўскіх каланістаў: Грайко, Баршчэўскага і Куліка. Пісьмо дапамагло.

Андрэй Грайко і ягоны любімец

Накіраваў ён сваю вершаваную просьбу ў 1977 годзе да польскіх цэнтральных улад, у якой надзвычай сардэчна прасіў дапамогі ў правядзенні на яго хутар электрычнага святла. І сапраўды, неўзабаве электрычная лямпачка заззяла ў роднай хаце Андрэя!

Таксама ў сямідзесятыя гады мінулага стагоддзя Андрэй звярнуўся з вершам-просьбай да камандзіра атрада Польскага Войска, у якім служыў яго адзіны сын Павел, каб адпусціў яго сына ў водпуск у жніўную пару. І сапраўды, сын неадкладна прыехаў і дапамог бацькам пры ўборцы ўраджаю! Трэба падкрэсліць, што інжынер Павел Грайко гэта надзвычай апякунскі чалавек у адносінах да сваіх пажылых і хваравітых бацькоў. Працуючы ў Беластоку, ён штотыдзень, на суботу і нядзелю, выязджаў на хутар, апекаваўся бацькамі і выручаў іх у цяжкай працы на гаспадарцы. Пасля смерці бацькі ён надалей апякуецца сваёй хворай аўдавелай маці.

Варта ўспомніць, што сям'я Грайко была надзвычай рэлігійная. Бацька Андрэя, Іван, быў папячыцелем у арлянскай царкве. Андрэй хадзіў па хатах і чытаў Псалтыр па нябожчыках-аднавяскоўцах.

Віктар Швед гасцюе ў брата

Вітаў ён вершам уладыку Саву, мітрапаліта варшаўскага і ўсяе Польшчы, перад уваходам у арлянскую царкву ў свята Івана Багаслова.

На працягу многіх гадоў Гмінны асяродак культуры ў Орлі запрашаў Андрэя Грайко на беларускія фэсты і дажынкі, якія адбываліся ў Арлянскай гміне. Выступаў ён на сцэне з цікавымі вершамі на беларускай і польскай мовах, дэкламуючы іх па-мастацку. Неўзабаве атрымаў ён ганаровае званне паэта Арлянскай гміны, пацверджанае шматлікімі дыпломамі.

Мы таксама абменьваліся вершамі з выпадку круглых гадавін нашага жыцця. Андрэй, крыху акрыяўшы пасля складанай аперацыі ў Бельскім шпіталі, пазваніў мне і між іншым запытаў: „Цікава, хто з нас выступіць з развітальным вершам?" Прызнаюся, ашаламілі мяне гэтыя словы. А можа ўжо ён прадчуваў надыходзячую смерць? Жыццёвы лёс мне прызначыў такую сумную місію.

Выступіў я над магілай Дарагога Брата з развітальным вершам, напісаным збалелым сэрцам.

Віктар ШВЕД

Развітанне

Памяці Андрэя Грайко

Гадалі мы, Браце,
Хто адыдзе першым,
Хто па Брата страце
Сум выкажа вершам?

І Ты быў таксама
Душою паэтам
І вершаў радкамі
Захапляўся светам.

Твой лёс больш складаны,
Працаваў няспынна,
Адышоў зарана
З зямелькі гасціннай.

Ды няма тут вечных
На Зямлі абліччы.
Да сябе бясспрэчна
Усіх Бог пакліча.

Цябе мы на свеце
Богу давяраем.
Хай Бог у апецы
Цябе заўжды мае.

Бывай. Баляць сэрцы.
Спі, спі з Божым Духам.
Няхай хоць па смерці
Зямля будзе пухам.

Віктар ШВЕД
15 ліпеня 2006 года

Дапамога добрым словам

Нядаўна ў Сопаце за кошт аўтара выйшла з друку кніжка Міхася Куптэля „Адгалоскі карэспандэнта". Пад адной вокладкай сабраны ў ёй плён больш чым дваццацігадовай ягонай карэспандэнцкай актыўнасці, пачатак якой датуецца 1982 годам.

Міхась Куптэль, ураджэнец Махнатага, жыве ў Сопаце і дзейнічае ў беларускім асяроддзі на Узбярэжжы. Адтуль інфармаваў ён аб грамадска-культурных падзеях з жыцця гданьскіх беларусаў і, як уважлівы чытач „Нівы", пільна сачыў за падзеямі на Беласточчыне. Але быў ён не толькі пасіўным назіральнікам. З вялікай ангажаванасцю адгукаўся на ніўскія публікацыі, палемізаваў з аўтарамі, падказваў спосабы вырашэння праблем, якія хвалявалі беларусаў Беласточчыны, стараўся, як сам напісаў „хоць добрым словам дапамагчы".

Гартаючы падборку ягоных ніўскіх карэспандэнцый 1982-2004 гадоў, як у люстэрку відаць, якімі праблемамі жыло тады наша асяроддзе. Першая карэспандэнцыя датычыла адсутнасці беларускіх назваў на карце Беласточчыны і была адгалоскай на артыкул Міхася Шаховіча. У чарговых допісах аўтар закранаў, між іншым, пытанні нацыянальнай свядомасці, роднай мовы, стварэння беларускага музея, цешыўся актыўнасцю студэнцкага руху, турбаваўся за якасць публікаваных у „Ніве" матэрыялаў, палемізаваў з ніўскімі калегамі па пяру.

У пачатку дзевяностых гадоў Міхась Куптэль адгукаўся на трывожныя допісы карэспандэнтаў, выкліканыя зменай палітычнага становішча ў краіне. Напрыклад, папракаў Аўрору, якая сумавала, што ў краіне і ва ўсім свеце мяняецца і суцяшаў, што змены даюць надзею на лепшае, уціхамірваў ваюючага Мікалая Панфілюка, палемізаваў з пазіцыяй дзеячаў БГКТ, якія стварэнне БДА ўспрынялі як замах на сваю арганізацыю, даказваючы, што беларусам патрэбны розныя формы дзейнасці.

Не абышоў увагай аўтар выбарчай тэматыкі, асабліва ў пачатку 1990-х гадоў, калі здавалася, што ў беларусаў ёсць шанц мець сваіх самастойных дэпутатаў у парламенце краіны. У 1993 г. пісаў ён, „што калі падыход кандыдатаў на паслоў, і не толькі іх, але і арганізацый да праблем грамадства будзе шчыры, сур'ёзны і адчувальны, у Сейме будзем мець не аднаго пасла, але цэлы Беларускі клуб". Аднак так не сталася.

Міхася Куптэля цікавіла таксама асвятлянне беларускай праблематыкі на старонках іншых выданняў, у тым ліку польскіх. Напрыклад, усхвалявала яго выказванне Юрыя Трачука ў часопісе „Wiadomości Kulturalne", у якім Беласточчыну на поўдзень ад Нарвы прылічыў да ўкраінскага арэалу („бяльмо на вочы найшло, ці розум камусьці адняло"). Рэагаваў таксама на фальшаванне суседзямі гісторыі Беларусі, калі з публікацый на старонках штодзённі „Gazeta Wyborcza" можна было зрабіць выснову, што народ і дзяржаўнасць Беларусі сфармаваліся дзесьці пры Лукашэнку. Асуджаў таксама недэмакратычны рэжым гэтага апошняга і ягоных прыхільнікаў у нас („а можа не сляпыя яны, а толькі бачаць нейкія свае палітычныя інтарэсы?").

Аўтар „Адгалосак карэспандэнта" ў згаданым перыядзе апублікаваў на старонках „Нівы" 171 допіс, у якіх закрануў шырокі спектр спраў датычных нашай грамадскасці. У іх наш карэспандэнт стараўся растлумачыць рэчаіснасць сённяшняга дня, заклікаў інтэлектуалаў з асяроддзя свядомых беларусаў рабіць тое ж самае, каб сваімі здольнасцямі падмацаваць старонкі тыднёвіка. І гэта яму ў вялікай ступені ўдалося, паколькі — як заўважыла ва ўступе да кніжкі Лена Глагоўская — ягоныя допісы „характэрныя выразнасцю думак і трапнымі заўвагамі наконт рэчаіснасці і месца ў ёй беларусаў".

Віталь ЛУБА

www.historyka.org

Любоў да Бацькаўшчыны ідзе поруч з любоўю да яе гісторыі. Зразумела, у мінулым кожнага народа ёсць як прыемныя, так і змрочныя старонкі. Але без ведання і тых, і другіх немагчыма зразумець многія падзеі сучаснасці сваёй Айчыны, больш таго — немагчыма знайсці нешта вартае для пераймання і перанясення ў цяперашняе жыццё. Для тых людзей, якіх цягне да больш дэтальнага вывучэння гістарычна-культурнай спадчыны характэрна вострае жаданне перанесціся на некалькі стагоддзяў назад. У гэтым мы можам упэўніцца, зазірнуўшы на сайт грамадскага аб'яднання „Гісторыка", які месціцца па адрасе http://www.historyka.org.

Галоўная старонка сайта зроблена даволі арыгінальна. На фоне выяўлення кавалкаў суровай тканіны месціцца інфармацыя, якой палічылі неабходным падзяліцца з віртуальным вандроўнікам стваральнікі гістарычнай бачыны. Абапал назвы сайта — фотаздымкі сярэдневяковых рыцараў і, пэўна, аднаго з гісторыка-культурных фэстаў, аб якіх вельмі падрабязна распавядаецца на іншых старонках. Дарэчы, гэтых старонак не надта многа — літаральна чатыры разам з галоўнай — „Навіны", „Фотагалерэя" і „Гасцёўня".

Сайт падзяляецца на традыцыйныя тры часткі. Праўда, на гэтым традыцыйнасць заканчваецца. Звычайна, на галоўнай старонцы аўтары распавядаюць ці то аб сваёй арганізацыі, ці то аб Інтэрнэт-праекце, які яны рэалізуюць. У даным выпадку нічога такога няма. Даведацца, што ёсць „Гісторыка", якія мэты і задачы яна перад сабой ставіць, а таксама як дакладна расшыфроўваецца абрэвіятура „МГА" — не прадстаўляецца магчымым. Аб гэтым на сайце ані слова. З таго ствараецца ўражанне, што сайту з большага адведзена роля своеасаблівага нататніка ці гістарычнага Інтэрнэт-часопіса выключна для сяброў адно толькі „Гісторыкі".

Тым не менш і выпадковым гасцям сайта знойдзецца на чым засяродзіць сваю ўвагу. Гэта, перад усім, рубрыка „Навіны". Тыя паведамленні, якія месцяцца там, цяжка назваць навіннымі, хоць і звязаныя яны з апошнімі падзеямі, што непасрэдна тычацца „Гісторыкі". Яны больш падобныя на пуцявыя гістарычныя нататкі, зробленыя сябрамі арганізацыі падчас вандровак у тую ці іншую мясцовасць. Вельмі падрабязна ў гэтым рэчышчы распавядаецца пра мястэчка Любча, дзе напярэдадні імі быў арганізаваны летнік.

Таксама цікавыя артыкулы тычацца Навагрудскага рыцарскага фэсту, у якім сябры гісторыка-культурнай арганізацыі прымалі актыўны ўдзел. Аб варунках, у якіх выспявалі і праходзілі магілёўскія паўстанні 1606-1610 гадоў, распавядаецца ў артыкуле „Народ для ўрада?". Тэкст размешчаны на сайце з нагоды 400-годдзя гэтых падзей.

Рубрыка „Фотагалерэя" прысвечана выключна навагрудскім рыцарскім мерапрыемствам. Згодна падрубрык здымкі мусілі распавядаць пра гэтыя турніры, якія праходзяць раз на два гады, з 2000 года. Але чамусьці маюцца здымкі пра 2000 і 2006 гады. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што мастацкая якасць здымкаў, якія распрацоўшчыкі сайта вырашылі называць малюнкамі, вельмі высокая. Гледзячы на выяўленні ўзброеных рыцараў і „мясцовы" люд у сярэдневяковых строях, узнікае жаданне паследаваць прыкладу сябраў „Гісторыкі" і хаця б на імгненне „перанесціся" на паўтысячагоддзе ў мінулае.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Падтрымалі „марку"

На мінулым тыдні ў сталіцы Венгрыі прайшоў чэмпіянат Еўропы па сучасным пяцібор'і. Беларускія майстры пентатлона яшчэ раз пацвердзілі, што яны прыналежаць да ліку фаварытаў турніраў самага высокага роўню. Усяго разыгрывалася 6 відаў (індывідуальная, камандавая і эстафетная намінацыі ў мужчын і жанчын). Медалі першынства кантынента ў Будапешце размеркаваліся наступным чынам: Венгрыя — 5, Расія — 4, Вялікабрытанія і Беларусь — па 3, Польшча, Украіна і Італія — па 1. Нашы суайчыннікі (галоўны трэнер каманды Валянцін Рогаў) здабылі ўзнагароды ў палове дысцыплінаў.

Асабліва парадавала ўраджэнка Слуцка Анастасія Самусевіч. Маладая 20-гадовая пяціборка паслядоўна ў сваёй яшчэ непрацяглай кар'еры нарошчвае паступальную хаду. У 2003 годзе яна была двухразовай бронзавай прызёркай юніёрскага чэмпіянату свету, чэмпіёнкай еўрапейскага юніёрскага першынства. У 2004 годзе ўзяла два срэбры ўжо на дарослым чэмпіянаце планеты. І вось новы поспех. У Будапешце Самусевіч перад заключным трохкіламетровым кросам была толькі пятай і адставала ад лідэркі ажно на 38 секунд. Гэта быў фантастычны забег, у якім беларуска не паспела дагнаць толькі алімпійскую чэмпіёнку — тытулаваную венгерку Жужану Вораш. У пратакольным выніку абедзве набралі па 5 508 пунктаў. Цаной золата сталі мізэрныя 18 сотых секунды, якіх забракла нашай пяціборцы. Срэбра перапала і ўсёй беларускай жаночай камандзе. Акрамя другога месца Анастасіі Самусевіч, ачкі прынеслі Тацяна Мазурэвіч (19-ы вынік) і Ганна Архіпенка (21-ы). Чацвёртая наша ўдзельніца — Тацяна Клімовіч таксама выйшла ў фінальную частку спабору (туды трапляюць 32 мацнейшых), але ў выніку стала толькі 30-й. Што датычыць асобных відаў, то беларускі найлепш стралялі, добра беглі, а праблемнымі сталі плаванне і фехтаванне. Што ж датычыць канкура, то верхавая язда, дзе коні выбіраюцца лёсаваннем, заўсёды ёсць элементам латарэі.

Мужчынская частка каманды можа наракаць на нешанцаванне і адпаведна недабор каштоўнага металу. Прыгадаем, што ў 2004 годзе ў балгарскай Албене беларускія хлопцы выйгралі еўрапейскі чэмпіёнскі тытул. Цяпер жа перад заключным відам асноўнага турніру — кросам — ішлі другімі, але не ўтрымалі пазіцыю і прапусцілі наперад Расію. Ну а першымі сталі гаспадары. У нас жа ў выніку — бронзавы медаль, які „кавалі" Міхаіл Пракапенка (8-ы вынік), Дзмітрый Мелях (12-ы), Ягор Лапо (14-ы) і Аляксей Андрухан (58-ы). Ачкі Андрухана, які не трапіў у фінал у залік не пайшлі. Канешне, можна было б спадзявацца і на большае. Прыкладам, мінчанін Мелях быў бронзавым прызёрам еўрапейскага першынства 2003 года.

Што датычыць эстафетаў, то нашы хлопцы і дзяўчаты сінхронна спыніліся на пятых пазіцыях. Каманда ў Беларусі адначасна досыць маладая і дасведчаная, так што рэзервы росту ёсць. Прыемна таксама, што ў пяцібор'і Беларусь робіць стаўку на сваіх выхаванцаў. Цяпер пяціборцаў чакаюць этапы Кубка свету, якія стануць трамплінам да чэмпіянату свету, што пройдзе ўвосень у далёкай Гватэмале.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

ПА ВІЛЕНСКІХ ВАКОЛІЦАХ

Група сяброў Таварыства беларускай культуры ў Літве ўжо была ў падарожжах па Беларусі, а нядаўна вырашылі і адправіліся ў падарожжа тут, недалёка ад Вільні, усяго ў абсягу амаль трыццаці кіламетраў. За кіраўніцай — спадар Хведар. Калі сядзіш з ім побач, адчуваеш упэўненасць — ён жа бывалы шафёр са шматгадовым стажам! Едзем кампаніяй у кірунку Майшаголы. Дарэчы, назва гэтай мясцовасці — з літоўскай мовы ды азначае мяшок і канец, а разам атрымліваецца канец мяшка.

Прыязджаем. Яшчэ раніца. У мястэчку сустракае нас Язэп Русакевіч. Ён шмат ведае пра гісторыю гэтага краю, падарожнічаў. Мы ходзім, а пабавіць вока не маем на чым — усюды заняпад, руіны: разбураныя не столькі часам, а больш рукамі чалавека. Сталоўка, пякарня, дом культуры (там у зале некалі былі скураныя крэслы, адбываліся сустрэчы на высокім узроўні, канцэрты)... засталіся толькі шкілеты будынкаў, як акрэслівае сп. Язэп: „усё пад завалам", а я дадаю: „сапраўднае дно мястэчка", назва адпавядае рэчаіснасці. У наш час тут няма нават лазні! Год дзесяць таму яна была прададзена ўсяго за 17 літаў (гэта ў той час за няпоўных пяць долараў) сваяку адной вельмі вядомай асобы. А ён ужо збыў будынак лазні за 40 тысяч літаў. Бізнес. Пакуль усё даволі змрочна. Нарэшце мы аддаляемся ад зарослых галлём рэшткаў будынкаў і падыходзім да месца, дзе некалі стаяў драўляны замак, а пасля яго спалілі крыжакі. На гэтым месцы стаіць камень з надпісам: „Князь Вялікага княства Літоўскага Альгірдас 1293-1377".

Майшагола — адзін з самых найстарэйшых населеных пунктаў Літвы. Тут яшчэ князь Ягайла збудаваў першы касцёл. Вядома, што ён быў драўляны і ўжо даўно згарэў. Падчас першай сусветнай вайны на гэтай тэрыторыі адбываліся маштабныя баявыя дзеянні, баі вяліся нават па некалькі тыдняў. У выніку засталіся нямецкія могілкі, але калі не ведаеш, то гэта проста лясок, бо шыкоўныя мармуровыя пліты былі расцяганыя і адшліфаваныя на свае патрэбы яшчэ пры савецкай уладзе. Мы бярэм кірунак у бок лесу. Прыкладна на адлегласці двух кіламетраў ад мястэчка знаходзіцца сховішча радыеактыўных рэшткаў. Распачалі іх складаць сюды яшчэ ў савецкі час, а цяпер гэтыя традыцыі працягваюцца. Ля ўваходу на тэрыторыю вельмі густа растуць скочкі. Іх часта садзяць на могілках. Тут яны растуць самі. Лясы на гэтым абшары вельмі грыбныя і ягадныя, а таксама надзвычайна прыгожыя краявіды.

Дукшты. Узгоркі, нізіны, рака Дукшта, мноства адценняў зялёнага колеру, буслы ходзяць ля самой дарогі. Цешым вочы ўсёй разнастайнасцю прыроды. Спыняемся ў запаведным месцы — самым найвялікшым па плошчы дубняку — дзе растуць не толькі дубы, але і ўсе іншыя дрэвы і кустарнікі, якія сустракаюцца па ўсёй Літве. Ходзім драўлянымі сцежкамі ад скульптуры да скульптуры. Гэта працы народных мастакоў — вялізныя драўляныя скульптуры язычніцкіх багінь і багоў. На дрэвах заўважаем выдаўжаныя птушыныя домікі з дзвюма дзірачкамі: адной маленькай круглай і другой нібы шчылінай з закругленымі краямі — гэта домікі для кажаноў. У Літве 9 гатункаў кажаноў, 7 з іх жывуць у гэтым запаведніку. Бачым вялізны камень, абсыпаны дробнымі цэнтамі, кожны з нас адшуквае дробязь і таксама як і тыя, хто быў ужо тут да нас, кідаем на камень ахвяру. Жаданні павінны споўніцца! Дуброва пакінула нам добрае ўражанне. Сюды не сорамна прыехаць нават з госцем. А пад канец нашага падарожжа спадар Язэп вырашыў пазнаёміць нас са старэйшым ксяндзом у Літве і мы, хоць коратка, але змястоўна, гасцявалі ў невялікім доміку ксяндза прэлата Ёзэфа Абрэмбскага. Зусім нядаўна, у сакавіку, ён адзначыў сваё 100-годдзе. Чытае без акуляраў, у яго светлая галава дый мае пра што і пра каго расказаць. На сценах некалькі працаў пэндзля Пётры Сергіевіча. Наўрад ці пра іх ведаюць гісторыкі мастацтва. З размовы высветлілася, што ксёндз вельмі блізка сябраваў з мастаком. Пётра Сергіевіч зрабіў у Майшаголе два алтары. Доўга не надакучваем шаноўнаму чалавеку. Развітваемся.

Прыемна здзіўляемся, што не трэба ехаць вельмі далёка, каб атрымаць уражанні, даведацца. Усё побач. Над намі плывуць лёгкія ліпеньскія воблачкі. На гарызонце — Вільня.

Крыстына БАЛАХОВІЧ
Вільня

Турыстычная Гайнаўшчына

Краявід з мосціка на р. Леснай

(працяг; пачатак у 29 н-ры)

У двух папярэдніх адрэзках я толькі павярхоўна расказаў пра турыстычныя прывабнасці той толькі часткі Белавежскай пушчы, якая знаходзіцца паміж шашой Гайнаўка — Белавежа і рэчкай Нараўкай. Прыгожыя, цудоўныя гэта месцы, але зусім не менш цэнныя, прывабныя, чароўныя і тыя зарэчныя куточкі. Гэта проста цэлы казачны край. І вельмі варта пабываць турыстам і там...

Сёння аднак пераедзем на паўднёвы бок згаданай шашы і прыглянемся гэтаму куточку пушчы. Тут таксама парэзана пушча паралельнымі да шашы дарогамі, як Шацкай, Гранічнай, Ягелонскай, Олембурскай... і перпендыкулярнымі трыбамі, як Астроўскага, Зялёнай, Звежынецкай... Недалёка ад Гайнаўкі, прасцюткай як страла лініяй, бяжыць ад шашы на поўдзень вузкакалейка. Яна даходзіць да мясцовасці Тапіла. Гэта і ёсць адна з найчасцей наведваных турыстамі мясцін гэтай часткі пушчы.

З Гайнаўкі да Тапіла даехаць веласіпедам можна дзвюма дарогамі. Даўжэйшай — праз вёскі Арэшкава і Лозіцы, 22 кіламетры. І карацейшай — праз Сахарэва да вузкакалейкі і ёю прасцютка да канца, 12 кіламетраў. Мне больш падабаецца карацейшая, але не таму што карацейшая, а таму, што цікавейшая, спакайнейшая, амаль бязлюдная. Да Сахарэва шырокая, самаходная, далей звужаецца, а потым і зусім пераходзіць у сцежку, але роўную, уезджаную і з цвёрдай наверхняй. Адно едзь, глыбока дыхай, любуйся — уся прыгажосць твая.

Адпачынак і перакур можна зрабіць на першым ці другім мосціку завешаным над балотам і стаячай вадой каля самай вузкакалейкі. І ўжо абавязкова затрымацца на мосціку праз рэчку Лесную. Адсюль добра відаць і рэчку, і даліну, праз якую цячэ яна. Даліна даволі глыбокая, берагі рэчкі нізкія, вада шырока разліваецца і творыць прыгожы багніста-балотны ландшафт, густа пакрыты чаротам. Добра і ціха паўглядаўшыся адсюль, можна многа цікавага ўбачыць. У чаротах, напрыклад, можна заўважыць рагастага лася, у паветры — шуляка і іншых птушак ды матылькоў, а на рэчцы — сямейку лебедзяў. Налюбаваўшыся ўсім гэтым, можам спакойна адпраўляцца ў Тапіла, адсюль яно ўжо недалёка. А там у сезон бывае даволі людна, бо едуць туды і на веласіпедах, і на машынах, і цэлыя групы па вузкакалейцы, каля якой мы толькі што ехалі. Гэтая лінія вузкакалейнай чыгункі ўвесь час працуе. Час праезду ад Гайнаўкі да Тапіла 45 мінут...

Белавежская пушча багатая сваёй фаунай і флорай. Расце тут мноства розных траў і зёлак, многія з якіх з'яўляюцца лячэбнымі. Мноства рознага кустоўя, напераменку з меншымі ці магутнымі дрэвамі-волатамі. Проста з небам шэпчуцца тут дубы, яліны, сосны...

Тут можна сустрэць белага і чорнага бусла, жураўля і чаплю. Лісу, ваўка, янота, барсука, рыся, бабра. Дзіка, аленя, лося, тарпана, зубра...

Калі пашчасціцца вам, можаце сустрэцца і з найбольшай „атракцыяй" пушчы — былым прэм'ерам і міністрам замежных спраў Польшчы Уладзімежам Цімашэвічам. Я, напрыклад, меў такое шчасце і сустрэўся з ім 12 чэрвеня.

Еду сабе спакойненька глухой пушчанскай дарожкай, любуюся буйнай вясенняй прыродай, слухаю задумлівага гоману дрэў, вясёлага спеву птушак, бзыкання пчолак... а мне насустрач раптам хтосьці прэцца на машыне. Прыглядаюся — а гэта ён, Цімашэвіч! І не ў госці едзе ён, і не на маленне — бо на трактары з прычэпам і апрануты непасвяточнаму.

— Чаму ж ён так?! — з нейкім канфузам падумаў я. — Сёння ж Дзень Святога Духа — другі дзень вялікага праваслаўнага свята Тройцы. А Белавежская пушча наскрозь праваслаўная. Вакол яе шчыльна абступілі праваслаўныя вёскі з цэрквамі, каплічкамі ды прыдарожнымі крыжамі, а ў цэнтры унікальная па архітэктуры і святасці Белавежская царква. І святая Крыначка. Сённяшні і заўтрашні дзень у яе асаблівыя — дзень і ноч ідзе там маленне. І ўшанаваць гэта ўсім пражываючым тут абавязкова трэба...

Я лічу вялікай радасцю і шчасцем бываць у нашай пушчы, назіраць за ёю. І я маю такое шчасце — рэгулярна бываю ў ёй і назіраю за ёю.

Белавежскую пушчу тутэйшыя беларусы і савецкія беларусы павінны добра пазнаць, любіць і шанаваць, бо не так ужо і многа аўтэнтычных цэннасцяў асталося ў нас. І не толькі таму, што гэта пушча, якіх няма ўжо ў Еўропе. Але і таму, што дзякуючы ёй адбываліся ў мінулым добрыя, прагрэсіўныя змены тут, як пабудова добрых бітых дарог, пракладзена чыгунка, былі заработкі ў лесе, ну і традыцыйнае, хаця часам і нелегальнае, карыстанне лесам. Нашы продкі жылі ў будынінах і хаваліся ў дамавінах таксама з пушчы...

Лепшую будучыню сучаснаму і будучым нашым пакаленням звязваем таксама з пушчай. Значыць, гэта не проста лес, а сімвал нашай бытнасці і долі тут. І таму берагчы пушчу абавязкова нам трэба. І не дапусціць, каб „тутэйшыя" сталіся раптам „стороннімі"...

Найправільней было б, каб уся Белавежская пушча стала дзяржаўным запаведнікам. Але не такім, у якім будзе гаспадарыць невядома хто, а мясцоваму насельніцтву ўваход у яе будзе забаронены і не можна будзе ні вырваць ягадку, арэшак ці падняць грыбочак...

Васіль САКОЎСКІ

Несумленныя прадаўцы

У вёсцы Чаромсе ў краме Экспартнага агенцтва SOV, у г.зв. „Курчаку", прадаюць мясныя вырабы, тэрмін прыгоднасці якіх ужо закончыўся. Прыкмячаю я такое як раней, так і цяпер. У час пакупак у нядзелю, 9 ліпеня, на каўбасы „жывецкай" віднела дата прыгоднасці: 28 чэрвеня. У краме такі тавар, на маю думку, не можа знаходзіцца не толькі ў продажы, але і на вітрыне. Калі я пацікавіўся справай, прадаўшчыца сказала наступнае: „Учора прывезлі. У час прыёму тавару мы не паглядзелі на дату". І зараз жа падала такі сам від каўбасы з тэрмінам прыгоднасці да 17 ліпеня. Няўжо гэта праўда, што са складоў высылаюць непрыдатны тавар? Калі так, дык кіраўніцтва фірмы павінна задбаць, каб такія факты ў будучыні больш не паўтараліся.

Справа не толькі тычыцца рэпутацыі прадпрымальніка, але здароўя кліента. У летні час даволі хутка можна атруціцца сапсаванай ежай, асабліва мясными вырабамі. Ці працаўнікі чаромхаўскага „Курчака" аб гэтым не ведаюць?

Але ёсць і другі бок медаля. Паводле закону прадавец абавязаны назіраць за тым, каб прадаваць тавар прыдатны для спажывання. У паказаным прыкладзе прадаўцы глядзяць на гэта, прыплюшчыўшы вочы. А мо справай пацікавіліся б інспектары дзяржаўнага гандлёвага кантролю? Ды не толькі ў „Курчаку". **(ус)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1000 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2006 r. upływa 5 września 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2006 r. wynosi 28,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 49,00 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 70,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 72,80). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 84,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 93,80), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 109,20), Australia — 10,00 (kwart. — 140,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Адгаданка

Каля алькова

З Міцкевіча і Дуніна-Марцінкевіча
(паліндрам)

З'ехаў у двор падчашыц у вазку пранцузкім,
Ён першы зашваргатаў не па-беларуску;
Першы ён ўвёў ў Літву заморску гаворку.
Ўсе завідывалі, к катораму дворку
Заехала двукольна бяда, чы драндуля,
Катора па-іхняму звалась карыюля.
За лякаяў дзве малы сталі сабачонкі,
На козлах сядзеў мемец, як дошчачка, тонкі,
Жураўліныя ногі, бачыцца дзве тыкі,
У панчошках, з пражкамі яго чаравікі,
На галаве чужыя воласы і з мехам;
Старыя дзівіліся чучалу са смехам,
А мужыкі хрысцілісь і шапталі ціха,
Што ў вазку заморскім ванэцкае ліха.
На край паў дур пранцузкі, маўляў бурна туча,
Як панкі маладыя, баш нехрыстаў куча,
Адчураліся Бога, пайшлі блуднай сцежкай
Дый узгардзілі праўдай, мясцовай адзежкай.
Жалосна было глядзець на малакасосаў,
Як шваргаталі носам, а часта без носаў,
Як заморскі пісулькі ўсюды разнасілі,
К новым законам, веры, адзежцы манілі,
Як здзекавалась хмара над народам знаці,
Бо Гасподзь, калі хоча край які скараці,
Адбярэ пярвей розум у сваім страшным судзе!..
І пацяглі разумных за нос дурны людзе.
Сам падчашыц быў пахож спераду і збоку
На заморскую малпу аслі на сароку.
Чужы волас каўтуном на галаве віўся,
Трасяні — пылок з мукі пад сам строп узбіўся!
Калі ж хто тагды й думаў, што адзежка польска
Прыстоіць чалавеку ляпей, як заморска,
То маўчаў у куточку, бо паны крычалі,
Што вучыцца розуму мы сваім мяшалі;
А што пранцуз уздумаў, палякі любілі.
Вось за вячэру селі, паелі, папілі.
Тут ўвайшла падкаморна, малада, прыгожа,
Яе румяна лічка вось квяціста рожа,
Тоненька, як тычынка, грудкі баш тачоны,
Сукеначка багата, цвет крэпка чырвоны,
Галоўка без чапочка, ў кружкі волас звіты,
У стужачкі, баш дзіця у пялёнкі, спавіты.
Хоць каротка сукенка, ножак не ўказала,
Бо па зямлі бягучы, дробненька шагала.
Пасля на крэсле сваём лягонька прысела
Тут жа каля паніча, нічога не ела.
Спярша ціха правіла яму аб маляванні,
Аб музыцы, аб разьбе, далей танцаванні!
Паказала, што знае ўсе цікавы штукі.
І паніч чуў ў Аршаве пра тыя навукі.
Падчашыц з падкаморнай, вельмі з сябе рады,
Адчурылісь ў пакойчык ад цэлай грамады;
Ён, шэпчучы, так блізка прыстаў к кабяцінцы,
Што цэлы загарэўся, вось смоль на лучынцы;
Губамі лавіў жадна яе ўздох міленькі,
А вокам хватаў іскры із гарачай зрэнкі.
Неспадзяна панічык далоньмі закрыўся,
Думаў штось ёй сказаці, толькі пакланіўся
І даў цягу ў куточак, а дзеўка дабыла
З алькова ліхтарню і кнот аб'ясніла,
Ды ў куток шыбанула з маланкай на твары.
Каб пабачыць пранцузкі яго саксуары.
Бо калісьці падчула, як старыя бабы
Гаварылі ў сакрэце, што іхні род слабы
То каб латва насіці свой цяжар жыццёвы,
Зваліць яго на хлопа, так як на воз дровы.
І, як стангрэт на козле, цугляў не ўпускаці,
А найболей то дышля трэба даглядаці.
Так дапала паніча аглядаць нябога —
Эх! _____ / _____ , вашэці, не відаць нічога...
А падчашыц не ведаў, чы з таго смяяца,
Чы радавацца сэрцам, аслі дзівавацца.

(Ш)

Рашэннем паліндрама з'яўляецца словазлучэнне, якое чытаецца аднолькава злева направа і справа налева, напр. *пчолка ПІЛА ЛІП нектар*.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 25 нумара

Агат, Атыла, Вега, сын, сяўба.

Рашэнне: **Пытайся не ў старога, а ў бывалага.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Анатолю Маўчуну** з Познані

МАЯ ПАСЕКА

У пчол — іскрынка Божага духу, і розум Небам ім дадзены
(з народнага)

Мёд — адзін з найбольш каштоўных харчпрадуктаў, але не столькі па прычыне салодкага смаку, паколькі па вялікай яго энергетычнай вартасці. Вяртанне да спажывання натуральнага мёду патрабуе прадстаўлення чытачам ведаў пра гэты вядомы ад вякоў прадукт харчавання.

Мёд змяшчае ў сабе каля 80% цукраў, што вырашае аб яго высокай энергетычнай каштоўнасці. У ліку цукраў пераважаюць глюкоза і фруктоза, якія ў арганізме пранікаюць у кроў, а затым у клеткі і ткані. Разам з імі ў арганізм пастаўляюцца вітаміны B_1, B_2, B_6, B_{12}, C, H, PP. Мёд трэба цаніць перш за ўсё з-за багацця ягонага саставу — вучоныя выявілі і апісалі ў ім 181 адно злучэнне, якія станоўча ўплываюць на фізіялагічныя працэсы чалавечага арганізма, аднаўляюць яго фізічныя і псіхічныя сілы.

Пчаліны мёд — змяшчае ён у сабе вугляводы, бялкі, мінеральныя рэчывы, вітаміны, ферменты і іншыя біялагічна актыўныя злучэнні, якія рэгулююць працэсы стрававання і выдзялення, а таксама функцыянавання сэрца.

Дыета з прымяненнем значнай колькасці мёду перш за ўсё рэкамендуецца дзецям і людзям, якія выздараўліваюцца, а таксама пакутуючым ад стомы. Пацверджана, што дзеці, якія рэгулярна з'ядаюць 2 лыжкі мёду штодзень, хутка папраўляюцца на вазе і ў іх павялічваецца колькасць гемаглабіну ў крыві. Спажываць мёд павінны таксама людзі, якія перайшлі хірургічныя аперацыі або цяжкія хваробы.

Мёд вылучаецца лячэбнымі ўласцівасцямі, аб чым сведчыць не толькі народная медыцына, але і доследы праведзеныя ў медыцынскіх установах. Мёдам з даўніх часоў саладзілі зёлкі, выкарыстоўвалі яго для выробу лячэбных мазей і пластыраў.

Сёння мёд прымяняецца ў якасці лякарства пры сардэчных захворваннях, пры хваробах стрававальнага тракту і дыхальных шляхоў, якія выклікаюць павышэнне тэмпературы. Дапамагае ён пры язве страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Даказана, што мёд рэгулюе працэс стрававання, што асабліва важнае пры шматлікіх хваробах, а таксама паспяхова лечыць захворванні нырак і мочаспускальнага канала.

Фермент інгібін у мёдзе, які мае супрацьмікробныя ўласцівасці, уздзейнічае ў бактэрыястатычны спосаб. Дзякуючы яму можна вылечыцца ад прастуды і запалення горла. Антыбіятычныя ўласцівасці мёду ўплываюць на працэс паскоранага загойвання ранаў.

Віктар БУРА

PS. У мяне свая пасека, над Семяноўскім вадасховішчам, у чыстым натуральным асяроддзі. Калі хто зацікавіцца мёдам, сардэчна запрашаю ў Рыбакі № 6.

IV Белавежскія мастацкія сустрэчы „Ператоча 2006"

Фонд „Царкоўная музыка" пры супрацоўніцтве з Белавежскім нацыянальным паркам, Белавежскім асяродкам культуры і Аддзелам ПТТК у Белавежы запрашае на **IV „Ператоча 2006"**.
Сёлетняя імпрэза адбудзецца ў амфітэатры ў Белавежы 29 - 30 ліпеня. Пачатак а 19 гадзіне.
У рамках праекта „Польска-беларускія прэзентацыі культуры Вялікага княства Літоўскага" чарговы раз прыпомнім, як багатую нацыянальную мазаіку складаў абшар Белавежскай пушчы. Сярод многіх народаў і этнасаў засяляючых некалі рэгіён, на гэты раз прадставім музычную культуру палякаў, беларусаў, украінцаў, літоўцаў, жыдоў, ромаў... На сцэне белавежскага амфітэатра запрэзентуюцца розныя гурты, між іншым, „Рябіна" з Жарнова, „Збучанкі" са Збуча, Курпёўская капэла, „Клюмпэ" з Пуньска, танцавальны калектыў „Тандэм", вакальны калектыў „Расняначка" (Беларусь) ды знакаміты спявак Міхал Скепка і іншыя.

30.07 – 05.08

Баран (21.03. — 19.04.) Флірт з канікул можа працягнуцца на ўсё жыццё. Грошы таксама палюбяць цябе на даўжэйшы час. Справішся з арганізацыйнымі справамі, і з сардэчнымі віраваннямі.

Бык (20.04. — 20.05.) Вушы ўверх, калі нават душа будзе пабольваць! Шчасце табе ўсміхаецца, мары здзяйсняюцца, калі толькі аб іх падумаеш. Марс у Дзеве вельмі моцна падтрымае твой арганізм.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Сустрэча з таямнічым незнаёмцам можа табе зусім закрунуць у галаве. Пачуцці замоцныя, каб з імі змагацца. Востры абмен думак з сябрам; гэта не мусіць вас падзяліць. Шмат працы.

Рак (22.06. — 22.07.) Шчасце ў каханні гарантуюць Венера і Юпітэр. Недахоп раўнавагі тэмпературы ў пачуццях, ды нічога кепскага гэта на прадказвае. Вакол цябе зайздроснікі, лепш ад іх трымайся здалёк.

Леў (23.07. — 22.08.) Справішся з хвастамі і ўсім, што цябе здаўна турбуе. Мары аб летнім ды гарачым флірце. Некаторыя аспекты твае натуры цябе самога проста задзівяць. Будзь асцярожны над вадой.

Дзева (23.08. — 22.09.) Памалу выкараскаешся з меланхоліі. Набярэш энергіі і прадпрымальнасці, возьмешся за рэалізацыю добрых ідэй. Удасца спаткаць людзей, з якімі ты даўно хацела пазнаёміцца.

Шалі (23.09. — 22.10.) Усё маеш нагоду задзівіць іншых і паказаць сябе з як найлепшага боку. Трохі нервовасці, блажэйшы настрой. Можаш хоцькі-няхоцькі сам на сябе накрунуць біч і не пазбегнеш паслядоўнасці сваіх паводзін.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Пераканаешся, што нічога не ўдасца зрабіць на сілу і на эфекты некаторых дзеянняў трэба цярпліва пачакаць. Або гарачая сварка разрадзіць атмасферу, або лёгка перанясеш расстанне і заменіш адно каханне наступным. Зусім забудзешся, што нядаўна перажываў цяжкія хвіліны!

Стралец (22.11. — 21.12.) Магчымыя немалыя прыбыткі. Іграй у латарэю. Можна грошы мець нават ад хобі. Дома сітуацыя паправіцца, але не будзе так як раней.

Казярог (22.12. — 19.01.) Поспехі ў грамадскіх справах. Можаш рэалізаваць з сябрамі супольныя планы, ды не раскідайся грашыма! Лепш у гэтыя дні не едзь за мяжу.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Знакаміта ў прафесійных справах. Можаш шмат зарабіць дадаткова, зрэалізаваць відны праект. У пары атмасфера можа быць настолькі цяжкая, што ты гатовы пашукаць суцехі.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Новыя пачуцці, новы вецер у крылы. У кампаніі ты зорка. У пары пара на роздумы. Можа адазвацца недапільнаваная ў час хвароба. Схочаш паказаць, якая ты арыгінальная і эксцэнтрычная, таксама перад сям'ёй (шакіраванне і выламванне са схем прынясе табе немалое задавальненне).

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960